Радыё
ПО ЧЫ:

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ ВСЯГО СВЕТУ, ЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 165 (3273) Аўторак, 23-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—319, кантора—781

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ПАРЫЖ, 18. На ўсіх вялікіх прадпрыемствах і ў ваколіцах Парыжа ствараюцца камітэты па правядзеньні Чырвонага дня. На чале руху ідуць мэталісты, тэкстыльшчыкі, будаўнікі і дрэваапрацоўшчыкі.

Конкурс на лепшы ўраджай у калгасах

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Калгассаюз пастанавіў правесьці конкурс на лепшы ўраджай ў калгасах. Прэм'яваццa будуць тыя калгасы, якія поўнасьцю выканалі мерапрыемствы па ўзьняцьці ўраджайнасьці.

1-е жніўня не за гарамі

Пастанова VI-га Кангрэсу Камінтэрну аб правядзеньні 1-га жніўня г. г. Міжнароднага Чырвонага Дня мае вялізарнейшае палітычнае значэньне. Па сутнасьці справы, за гады існаваньня Камуністычнага Інтэрнацыяналу, гэта першае, арганізаванае адначасова ва ўсіх краінах сьвету, выступленьне пралетарыяту і прыгнечаных калёніяльных народаў супроць новай вайны, якая ліхаманкава падрыхтоўваецца. Ужо адно прыняцьце гэтай пастановы кангрэсу надзвычайна паказальнае. Гэта пастанова не магла быць ухвалена раней: характэрныя высы «трэцяга пэрыяду», што перакываецца намі—нястойлівасьць стабілізацыі капіталізму і вялікае паляваньне сусьветнае рабочае клясы зрабілі магчымым і неабходным прыняцьце такой пастановы.

Паведамленьні з усіх кутоў сьвету, з Эўропы і Азіі, Афрыкі і Амэрыкі, з далёкай Аўстраліі гавораць аб тым, што пралетарыят узмоцнена рыхтуецца да правядзеньня Чырвонага дня.

Але скрозь і ўсюды капіталістыя і іх верныя псы—сацыял-згодніки такама ўзмоцнена рыхтуюцца да папярэджаньня і прыдушэньня гэтага пралетарскага выступленьня. Ня можа быць сумненьняў у тым, што ў радзе краін выхад пралетарыяту на вуліцу ў гэты дзень будзе надзвычайна цяжкім. Але ня можа быць сумненьня і ў тым, што гэта ніколькі ня зьменіць становішча рэчаў. Голас пратэсту супроць новай бойні, голас у абарону сацыялістычнае бацькаўшчыны пралетараў усіх краін прагучыць моцна і праз паліцэйскія кардоны.

Буржуазія баіцца гэтага арганізаванага выступленьня мас, хоць яна добра разумее, што Камінтэрн у гэты дзень зусім ня зьбіраецца «наладжваць сусьветнай рэвалюцыі». Задачы гэтага дня зусім не такія шырокія.

Яны заключаюцца ў магутным пралетарскім пратэсьце супроць новых войн, супроць вакханаліі ўзбраеньняў, супроць цкаваньня Савецкага Саюзу і вайны, якая падрыхтоўваецца супроць яго. І калі міжнародны капітал так баіцца гэтага пралетарскага выступленьня, то сапраўды небясьпечна і нястойліва яго становішча!

У савецкай краіне гэты дзень пройдзе пад знакам далейшай мабілізацыі рабочых і працоўнага сялянства вакол лёзунгаў камуністычнай партыі і савецкай улады, далейшага згуртаваньня працоўных мас нашай краіны вакол задач выкананьня вялікага пляну сацыялістычнага будаўніцтва—лепшай гарантыі ўмацаваньня абароназдольнасьці нашага Саюзу.

У нас у БССР, таксама як і ва ўсім Саюзе разгарнулася і праходзіць энэргічная падрыхтоўка да правядзеньня Чырвонага Дня. Вялікія мітынгі, што адбыліся ва ўсіх гарадох нашай рэспублікі ў зьвязку з падзеямі на Ўсходзе-Кітайскай чыгунцы, рух пратэсту супроць кітайскіх налётчыкаў, які разгортваецца ў нашай вёсцы—лепшыя довады баявой гатоўнасьці працоўных мас стаць грудзьмі на абарону заваёў Кастрычніка. Няма сумненьняў у тым, што дзень 1-га жніўня будзе ў нас праведзены, як грандыёзная дэманстрацыя сіл і магчымасьцяй, закладзеных у краіне перамогшага пралетарыяту.

Гэта ня выключае, аднак, неабходнасьці ў паасобных мясцох, на паасобных вучастках (гл. сёньняшнія паведамленьні ў нашай газэце) пасьпяшыць і падцягнуцца з падрыхтоўкай да Чырвонага Дня. Нельга дапускаць, каб розныя арганізацыйныя і іншыя няўвязкі мелі-б хоць малы ўплыў на правядзеньне дня 1-га жніўня.

Чырвоны Дзень павінен і будзе праведзены ў нас як яшчэ нябачная і нячуваная па магутнасьці, сіле, захапленьні і ўздыме дэманстрацыя рабочае клясы і працоўнага сялянства.

Адкрыўся II кангрэс антыімпэрыялістычнай лігі

АНТЫІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫ КАНГРЭС МОЛАДЗІ

Антыімпэрыялістычныя дні ў Франкфурце-на-Майне

ФРАНКФУРТ НА МАЙНЕ, 21. У добра ўпрыгожанай вялікай залі імадрому пасьля масавага рабочага мітынгу адбылося адкрыцьцё другога сусьветнага кангрэсу лігі барацьбы з імпэрыялізмам і калёніяльным прыгнечаньнем.

Адкрываючы кангрэс, генэральны сакратар Лігі Мюнцэнбэрг (камдэпутат нямецкага рэйстагу) вітаў усе дэлегацыі прыбыўшыя на кангрэс, і асабліва дэлегацыю СССР і Кітая. Мітынг наладзіў доўгую бурную авацыю ў гонар СССР. Мюнцэнбэрг ў сваёй прамове даў кароткі агляд разьвіцьця анты-імпэрыялістычнай лігі за пэрыяд паміж першым брусэльскім кангрэсам лігі і другім, што сабраўся цяпер ва Франкфурце на Майне.

Ён падкрэсьліў, што цяпер ліга апіраецца на пашыраную сетку баяздольных арганізацый.

Цэнтральнымі пытаньнямі ў прамовах, выступаўшых прамоўцаў, былі савецка-кітайскі канфлікт і пытаньне аб тактыцы і стратэгіі лігі. У той час як на першым пытаньні высьвятлілася поўнае аднадушша ўсяго кангрэсу, па другому пытаньню намеціўся рад разгалосьсяў. Старшыня лігі Мэкстон (дэпутат ангельскага парламэнту, старшыня ангельскай незалежнай партыі) падкрэсьліў, што ў савецка-кітайскім канфлікце, іноўпіраваным імпэрыялістымі ўсе антыімпэрыялістычная ліга на баку СССР. Мэкстон падкрэсьліваў, што ён у якасьці старшыні лігі, прызнае неабходнасьць поўнага вызваленьня Індыі ад Англіі.

Спатканы бурнымі авацыямі, якія працягваліся некалькі хвілін, тав. Мельнічанскі вітаў кангрэс і прысутных франкфурцкіх рабочых, а таксама і нямецкую рабочую клясу ад імя 12-ці мільёнаў арганізаваных рабочых СССР.

Ліга барацьбы з імпэрыялізмам і калёніяльным прыгнечаньнем павінна ператварыцца ў прапагандысцкай арганізацыі ў баявую. Надзвычайна важна ведаць, хто прыяцель, а хто вораг лігі. Мэкстон гаварыў у сваёй прамове аб міруцкім працэсе, аднак, ён умацоўваў аб тым, што працэс праводзіцца якраз урадам Макдональда. Мэкстон умацоўваў аб тэй ганебнай цяганіне, з якой так званы рабочы ўрад падыйшоў да пераговараў аб аднаўленьні англа-савецкіх зносін. СССР не дапусьціць, каб яго правакавалі на ваенную авантуру, бо ён хоча міру, каб прыцягваць сацыялістычнае будаўніцтва.

Але адначасова СССР гатоў даць адпор ўсякаму імпэрыялістычнаму нападу. Задача лігі—весьці сур'ёзную і бязупынную барацьбу супроць імпэрыялістычнай вайны, за вызваленьне прыгнечаных народаў.

Пасьля кароткай прамовы, спатканага бурнымі апладысмэнтамі Барбюса, дэлегаты кангрэсу лігі і прысутныя працоўныя аднагалосна ўхвалілі маніфэст да ўсіх рабочых і сялян Кітая і СССР, да прыгнечаных народаў і працоўных мас усяго сьвету. У маніфэсьце гаворыцца, штэ другі сусьветны кангрэс антыімпэрыялістычнай лігі заклікае працоўных і прыгнечаныя масы ўсяго сьвету рашуча пратэставаць супроць імпэрыялістычнага нападу на СССР і згуртавацца да абароны СССР. Кангрэс зьвяртаецца ў першую чаргу да рабочых і сялян Кітаю з заклікам падвоіць намаганьні да барацьбы за зьвяржэньне чужаземнага імпэрыялістычнага ярма і яго лёкаеў і нанкінскага ўраду.

Далей кангрэс ухваліў дэклярацыю салідарнасьці ў адносінах міруцкага працэсу.

Асноўныя задачы моладзі ў барацьбе супроць вайны

ФРАНКФУРТ НА МАЙНЕ, 21. У дакладзе аб задачах моладзі ў барацьбе супроць імпэрыялістычнай вайны Рэст падкрэсьліў, што асноўныя задачы моладзі заключаюцца ў абароне СССР, у барацьбе супроць нацыянальнага прыгнечаньня і за прыгнечаную моладзь калёніяльных і паўкалёніяльных краін, а таксама ў барацьбе супроць капіталізму, як крыніцы нацыянальнага прыгнечаньня.

Па другому пункту парадку дня: аб становішчы працоўнай і вучнёўскай моладзі ў калёніяльных і поўкалёніяльных краінах выступіла 7 дакладчыкаў.

На заключным пасяджэньні з дакладам аб жыцьці і барацьбе працоўнай моладзі СССР выступіў т. Косараў спатканы бурнымі авацыямі і пяяньнем Інтэрнацыяналу. Тав. Косараў дакладна ахарактарызаваў дасягненьні савецкай моладзі ў палітычнай, эканамічнай і культурнай галіне, падкрэсьліўшы, што барацьба савецкай моладзі вядзецца ня толькі на фронце сацыялістычнага спабэрніцтва, але і за вызваленьне прыгнечаных калёній. Адначасова савецкая моладзь разьлічвае і на тое, што антыімпэрыялістычная моладзь усяго сьвету падтрымае СССР пры адбіцьці ўсіх атак імпэрыялістых.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі кангрэс аднагалосна прымае адозву да калёніяльнай моладзі і маладых барацьбітоў. Далей абіраецца міжнародны камітэт моладзі, якому даручана ажыцьцяўляць цэнтралізаванае кіраўніцтва антыімпэрыялістычнай барацьбой моладзі ўсяго сьвету.

Кангрэс скончыўся аднагалосна прыняцьцем прывітальнай дэклярацыі да рабоча-сялянскай моладзі СССР, запраўданаваній прадстаўніком кітайскай моладзі Ло Ці-інам. У гэтай дэклярацыі антыімпэрыялістычны кангрэс моладзі шле братэрскае прывітаньне рабоча-сялянскай моладзі СССР, якая змагаецца пад кіраўніцтвам ленінскага камсамолу ў першых радох супроць імпэрыялістых. Дэлегаты кангрэсу клянуцца, што стануць бок аб бок з савецкай моладзьдзю на перадавую лінію ў барацьбе супроць падбухторшчыкаў вайны.

Рэвалюцыйная моладзь усімі сродкамі будзе абараняць СССР

ФРАНКФУРТ НА МАЙНЕ, 20. Антыімпэрыялістычныя дні ў Франкфурце на Майне пачаліся адкрыцьцём антыімпэрыялістычнага кангрэсу моладзі. На кангрэсе ўдзельнічаюць прадстаўнікі моладзі Індыі, Кітая, Інданэзіі, Лацінскай Амэрыкі, Паўночнай Афрыкі, Манголіі, Францыі, Англіі, Японіі, Карэі, Нарвэгіі, Швэцыі, Балканскіх краін, Галяндыі, Швэйцарыі, Бэльгіі, Нямеччыны, а таксама прадстаўнік Камуністычнага Інтэрнацыяналу моладзі і чырвонага Спартінтэрну.

Адкрыцьцё кангрэсу прайшло пад знакам барацьбы супроць ваеннай небясьпекі ў зьвязку з нячуванай правакацыяй нанкінскага ўраду. На кангрэсе ўдзельнічаюць члены выканкому антыімпэрыялістычнай лігі.

Адкрываючы кангрэс тав. Лейдбранд (Нямеччына) паведаміў, што дэлегаты савецкай моладзі знаходзяцца ў дарозе. Кангрэс спаткаў гэтае паведамленьне бурнымі воплескамі.

Ад імя выканкому антыімпэрыялістычнай лігі кангрэс вітаў тав. Саклатвала. Ён зазначыў, што антыімпэрыялістычная моладзь зьяўляецца надзеяй і будучыняю ў справе барацьбы з імпэрыялізмам і прыгнечаньнем калёніяльных народаў. Саклатвала падкрэсьліў необходнасьць арганізацыйнага афармленьня антыімпэрыялістычнага руху. Канчаючы сваю прывітальную прамову Саклатвала ганьбіў наглыя дзеяньні панкійскага ўраду, які правакуе вайну.

У прэзыдыуму кангрэсу абраны: т. т Косараў (СССР), Рэст (КІМ) і прадстаўнікі Індыі, Кітая, Інданэзіі, Паўночнай Амэрыкі, Лацінскай Амэрыкі, Прафінтэрну, Нямеччыны, Англіі, Францыі і Галяндыі.

Выступаўшы з дакладам аб задачах працоўнай моладзі ў барацьбе супроць імпэрыялістычнай барацьбы Рэст ахарактарызаваў міжнароднае становішча, асабліва спыняючыся на савецка-кітайскім канфлікце. Рэст падкрэсьліў, што нанкінскі ўрад зьяўляецца толькі выканаўчым органам імпэрыялістых і асабліва Англіі і Амэрыкі. **Новы ангельскі ўрад знайшоў час заключаць морскую згоду з нанкінскім урадам, аднак, яму няма часу было аднавіць дыпляматычныя зносіны з СССР.** Цьверджаньне імпэрыялістых і іх агентаў «аб чырвоным імпэрыялізьме» хлусьня і паклёп, аб чым **яскрава сьведчыць 11-ці гадовая гісторыя замежнай палітыкі СССР.** Калі імпэрыялістыя адважацца пераступіць савецкія межы, то рэвалюцыйная антыімпэрыялістычная моладзь усімі сродкамі будзе абараняць бацькаўшчыну працоўных разам з працоўнымі СССР.

Кангрэс антыімпэрыялістычнай лігі моладзі вітае рэвалюцыйныя рабочыя масы Кітая, якія абернуць імпэрыялістычную вайну ў пераможную грамадзянскую вайну.

Антываенная канфэрэнцыя ў Вэне

ВЭНА, 20. Адбылася скліканая кампартыяй і рэвалюцыйнымі арганізацыямі Вэны і яе ваколіц антываенная канфэрэнцыя пры ўдзеле 180 дэлегатаў. З прывітаньнямі ад імя бэрлінскага камітэту барацьбы з ваеннай небясьпекай на канфэрэнцыі выступіў замуністычны дэпутат нямецкага рэйхстагу тав. Пік.

Пастаноўлена зьвярнуцца да рабочых Вэны і ваколіц з заклікам правесьці 1-га жніўня аднагадзінную забастоўку пратэсту і прыняць удзел у вулічных дэманстрацыях. Для падрыхтоўкі і правядзеньня антываеннага дня абраны камітэт у складзе 18-ці сацыял-дэмакратаў, 7-мі беспартыйных і 15 камуністых. Канфэрэнцыя прайшла пад знакам абароны СССР ад кітайскіх імпэрыялістых.

БЭРЛІН, 20. У Базэлі (Швэйцарыя) арганізаваны сталы камітэт барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, які будзе кіраваць падрыхтоўкай і правядзеньнем дэманстрацый 1-га жніўня.

Піянэрскі лягер імя т. Варашылава ў Нямеччыне

13-га ліпеня адкрыўся недалёка Бэрліну піянэрскі лягер імя Варашылава. На здымку: Шэсьце піянэраў у дзень адкрыцьця лягеру.

Магутная хваля пратэсту працоўных БССР

НА БЯСЧЫНСТВЫ КІТАЙСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ ПРАЦОЎНЫЯ АДКАЗВАЮЦЬ ПАДПІСКАЙ НА 3 ПАЗЫКУ І ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ДНЯ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Рабочыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» заяўляюць сваёй дзяржаве і партыі, што не спалохаюцца замежнага ворага, як не спалохаліся труднасьцяй на гаспадарчым фронце.

Мы ня хочам вайны, але ня хочам цярпець больш правакацый з боку сусьветных падпальшчыкаў яе і іх наймітаў-лёкаеў. Абяцаем ураду і партыі з напружаньнем усіх сіл і энэргіі працягваць будаўніцтва нашай савецкай гаспадаркі, умацоўваць абароназдольнасьць краіны, падтрымліваць 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Рабочыя заяўляюць, калі трэба будзе, дык яны зьменяць іголку і прэс на стрэльбу і штых, зброю працы—на зброю вайны.

На абарону СССР і заваёў Кастрычніка рабочыя «Кастрычніку» заўсёды гатовы.

***

Мы, курсанты чырвонаармейцы і начскład АЕВШ абураны наглымі ўчынкамі кітайскай рэакцыі ў адносінах да СССР.

Мы ня толькі пратэстуем, але і заяўляем, што гатовы сваёю зброяю абрубаць нахальныя рукі, што захапілі К. Усх. чыгунку, пабудаваную мазаляміі, потам і крывёю рабочае клясы былой царскай Расіі.

Працоўныя Кітая з намі, а стаўленьнікам англа-японскага імпэрыялізму, кітайскім мілітарыстым—штых пад рабро. Тады яны зразумеюць, што мы не даволім бязконца зьдзекавацца над нашымі прадстаўнікамі і правамі.

Няхай наш урад ведае, што мы, курсанты, ў кожную хвіліну гатовы да выступленьня і да баявой абароны інтарэсаў працоўных СССР.

ПОРАХ ТРЫМАЦЬ СУХІМ

18 ліпеня адбыўся другі агульна-палкавы мітынг пратэсту супроць свавольства кітайскіх улад.

Пад нястрыманыя гукі «ура» чырвонаармейцы адзін за адным у сваіх выступленьнях запэўнялі;—

— Мы гатовы баявую вучобу прыкласьці на практыцы.

— Савецкі ўрад можа разьлічваць на нас у любую хвіліну.

— Межы савецкай краіны непарушныя. Той, хто пераступіць нагою на нашу тэрыторыю, ня ўнясе яе больш назад...

Ва ўхваленай рэзалюцыі полк заяўляе аб сваёй гатоўнасьці да абароны межаў СССР, патрабуе ад ураду рашучых мер да спыненьня незаконных дзеяньняў кітайскіх мілітарыстых, абяцаючы яшчэ больш прыналегчы на баявую вучобу.

Пад канец мітынгу выступіў начальнік палкавога харчаваньня і заявіў:

— На падзеі на К. Усх. чыг. мы павінны адказаць дапамогай дзяржаве ў яе вялікім будаўніцтве. Я падпісваюся на 200 проц. месячнай пэнсіі (220 р.) на 3-ю пазыку індустрыялізацыі і выклікаю ўвесь кампалітсклад палка. Сход сустрэў гэтую заяву бурнымі воплескамі.

— Будзем узмацняць баяздольнасьць краіны, будзем дапамагаць яе гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву, пазычым вольныя грошы дзяржаве.

***

Працоўныя далёкага кутку Беларусі туты «Працы», Полацкай акр. патрабуюць ад савецкага ўраду самых рашучых мер супроць наглай кітайскай контрэвалюцыі—зброі сусьветных імпэрыялістых. Мы заяўляем, што **створаную намі пралетарскую дзяржаву мы абаранялі, абараняем і будзем абараняць** на ўсіх франтох. Мы патрабуем безадкладнага ўводу кітайскіх войск з нашай мяжы. Мы патрабуем безадкладнага вызваленьня ўсіх арыштаваных грамадзян СССР.

Мы заяўляем, што вайны ня хочам, але пры першым закліку ўладу працоўных і камуністычнай партыі **усе як адзін выступім на абарону Савецкага Саюзу.**

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя! Няхай жыве СССР.

***

Мы, рабочыя, чырвонаармейцы, члены прафсаюзаў і ўсе працоўныя г. Слуцку рашуча пратэстуем супроць бандыцкага налёту кітайскай ваеншчыны на К. Усх. чыг.

Гэты налёт зьяўляецца чарговай правакацыяй з боку сусьветных імпэрыялістых, якія імкнуцца выклікаць СССР —першую краіну пралетарскай дыктатуры—на новую вайну. Нам памятна кроў нашых дарагіх таварышоў Бароўскага і Войкава, нам памяты налеты на гандлёвае прадстаўніцтва і паўнадобра бачым, як за шырмаю розных канфэрэнцый па разбраеньню розныя імпэрыялістычныя акулы рыхтуюць атручваючыя газы.

Мы заяўляем, што створаную намі пралетарскую краіну абаранялі, абараняем і будзем абараняць і патрабуем ад нашае ўлады прыняцьця самых рашучых мер супроць абнаглеўшай кітайскай контр-рэвалюцыі.

Мы патрабуем неадкладнага ўводу кітайскіх войск з нашай мяжы, неадкладнага вызваленьня ўсіх арыштаваных савецкіх грамадзян і аднаўленьня рабочых арганізацый.

Аналёгічныя рэзалюцыі пратэсту рэдакцыяй атрыманы ашчэ ад працоўных Пухавіцкага раёну, Менскае акругі, ад рабочых і служачых аб'яднанага рабачкому № 10 ст. Асіпавіча, ад агульнага сходу членаў саюзу чыгуначнікаў Калінкавіцкага вузлу, ад агульнага сходу грамадзкіх арганізацый і ячэек МОПР'у г. Воршы, ад членаў саюзу, грамадзкіх арганізацый і працоўных м. Коханава, Аршанскай акругі; ад рабочых сэзоньнікаў на пабудовах МББ у Воршы; ад агульнага сходу беднаты з удзелам працоўнага насельніцтва м. Халопенічы; ад рабочых і служачых дапрызыўнікаў полацкага чыгуначнага вузлу; ад агульнага сходу рабочых і служачых мэталістых Полаччыны, ад працоўных фабрыкі «Прафінтэрн» (Бабруск), ад рабочых заводу «Інтэрнацыянал» у Рэчыцы; ад рабочых Мазырскага бровару; ад агульнага сходу рабочых лесазаводу «Пралетары», ад рабочых і служачых і на вуковых працаўнікоў Цэнтральнай бульбяной станцыі, (Менск), ад агульнага сходу рабочых племгасу супольна з сялянамі ваколічных вёсак, Сёньніцкага сельсавету, Віц. акр., ад агульнага сходу чырвонаармейцаў і начскладу лягеру «Чырвонае ўрочышча», ад агульнага сходу вайсковаслужачых №-кага конна-артылерыйскага дывізіёну і ад агульнага сходу рабочых і служачых картоннай фабрыкі імя Леніна.

***

Рабочыя Аўтакіраўніцтва катэгарычна пратэстуюць супроць бандыцкага захопу Кіт.-Усх. чыгункі, разглядаючы гэта, як чарговую і найбольш наглую правакацыю з боку сусьветных імпэрыялістых, правакацыю, якая мела на мэце выклікаць СССР, першую краіну дыктатуры пралетарыяту — на вайну, каб задушыць Савецкі Саюз.

Мы патрабуем неадкладнага адыходу войск ад нашае мяжы. З свайго боку мы запэўняем урад, што ў кожную хвіліну гатовы стаць на абарону Савецкае дзяржавы.

***

Па загаду буйных капіталістычных драпежнікаў, кітайская белагвардэйшчына сваім бандыцкім налётам на КУЧ, прабуе зноў парушыць сацыялістычнае будаўніцтва Савецкага Саюзу ў мірных умовах.

Мільёны працоўных Савецкага Саюзу абураны гэтым наглым учынкам кітайскіх бандытаў.

Байцы і камандны склад №-га беларускага артылерыйскага палка выносяць свой баявы пратэст супроць гэтай правакацыі сусьветных імпэрыялістых.

Чырвоная армія разам з усімі працоўнымі СССР хоча міру, але калі гэта будзе патрэбна, калі хто небудзь памкнецца перайсьці нашы межы—мы сталёвай узброенай сьцяною зможам абараніць нашу сацыялістычную краіну.

Прэч кітайскіх налётчыкаў і іх капіталістычных падбухторшчыкаў.

Няхай жыве наша краіна, у якой будуецца сацыялізм, і яе шчыры магутны вартаўнік—Чырвоная армія.

Ад працоўных г. Магілеву, ад рабочых, сялян і служачых м. Бялынкавіч, Касьцюковіцкага раёну, ад агульнага сходу чырвонаармейцаў і начскладу лягернага збору ім. Дзяржынскага разам з грамадзянамі м. Заслаўя, ад агульнага сходу партыйцаў камсамольцаў, сельска-гаспадарчых і чыгуначных рабочых, сялян, саматужнікаў і служачых м-ка Смалявіч, ад рабочых—будаўнікоў, занятых на пабудове ўнівэрсытэцкага гарадка, ад агульнага сходу працоўнага насельніцтва м. Капыля, ад рабочых і тэхнэрсаналу і служачых кіраўніцтва начальніка работ, вайскова-служачых №-га кавэскадрону стралковае дывізіі і інш.

Забастовачны рух за мяжою

Лёкаут 10 тысяч рабочых у Парыжы

Італьянская забастоўка парыскіх будаўнікоў

ПАРЫЖ, 19-7. У зьвязку з адмовай большасьці прадпрыёмцаў павялічыць заработак і дапусьціць рабочых—дэлегатаў да абсьледваньня пытаньня аб гігіене і бясапраснасьці працы парыскія землякопы і цэмантоўшчыкі па дырэктывах унітарнага прафсаюзу будаўнічых рабочых абвясьцілі ўчора на розных пабудовах Парыжу італьянскую забастоўку.

Прадпрыёмцы адказалі на гэта лёкаутам, які ахапіў каля 10.000 рабочых. Унітарны прафсаюз будаўнічых рабочых заклікае лёкаутаваных у выпадку аднаўленьня прадпрыёмцамі будаўнічай работы не аднаўляць работы, пакуль ня будуць здаволены іх патрабаваньні.

У першы дзень лёкауту будаўнічых рабочых ў Парыжы, лёкаутызаваныя рабочыя, згодна паказаньня ўнітарнага прафсаюзу, сабраліся на тых будоўлях, дзе яны працавалі, а адтуль згуртаванымі групамі накіраваліся ў памяшканьне ўнітарных прафсаюзаў. У гэтым памяшканьні былі наладжаны два мітынгі, у якіх удзельнічала ў агульнай складанасьці, звыш 10.000 рабочых. Выступаўшыя на мітынгах прамоўцы заклікалі рабочых да ращучай барацьбы супроць прадпрыемцаў і супроць штрэйкбрэхэраў.

Рабочыя Аргэнтыны трымаюцца стойка

НЬЮ-ЁРК, 19. Як паведамляюць з Буэнос-Айрэсу (сталіца Аргэнтыны), усеагульная забастоўка ў порце Розарыо ня спыняецца. Між бастуючымі і паліцэйскімі здарылася сутычка, у якой паранен адзін паліцэйскі і адзін бастуючы.

Забастоўка гарнякоў у Аўстраліі

ЛЁНДАН, 19. Як паведамляюць з Сіднэя (Аўстралія), перагаворы паміж капальняўласьнікамі і прадстаўнікамі горнарабочых у новым Паўднёвым Уэльсе не прывялі да згоды. Забастоўка ня спыняецца.

Міруцкі працэс аднавіўся

ЛЁНДАН, 18. У Міруце зноў слухаецца справа 31-го дзеяча індыйскага рабочага руху. Абвінавачаныя ўвайшлі ў залю пасяджэньня сьпяваючы «Інтэрнацыянал» і з воклічамі «Прэч імпэрыялізм». Сьведкі абвінавачаньня заяўлялі, што ў аднаго з абвінавачаных былі знойдзены брашуры і іншыя дакументы, якія датычаць бліжэйшых задач індыйскіх камуністых, і ідуць нібы ад Камінтэрну.

Сустрэча кіраўнікоў К.-Усх. чыгункі ў Маскве

Гутаркі супрацоўніка ТАСС з т. Емшанавым

МАСКВА, 22. У нядзелю, а 9 гадз. 20 м. раніцы ў Маскву прыбылі высланыя з Харбіну кіраўнік К.-Усх. чыг. Емшанаў з сям'ёй, яго памочнік, галоўны інжынэр дарогі т. Эйсмонт і іншыя.

На пэроне Паўночнага вакзалу прыехаўшых сустракалі рабочыя маскоўскага чыгуначнага вузла і супрацоўнікі НКШЗ на чале з членам калегіі т. Рудым. Тав. Емшанаў быў спатканы бурнымі прывітальнямі. На пэроне быў наладжаны мітынг.

Бурнымі воплескамі і крыкамі «ўра» ўдзельнікі шматлікага мітынгу прымаюць рэзалюцыю, у якой ўхваляюць дзеяньні савецкага ўраду, патрабуюць яшчэ большага размаху ў нашым будаўніцтве і вітаюць выпуск 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

У гутарцы з супрацоўнікам ТАСС кіраўнік К.-Усх. чыг. тав. Емшанаў паведаміў, што налёт на К. Усх. чыг. быў зроблены па строга распрацаванаму пляну. Атрады белых эмігрантаў, што апэравалі на чыгунцы, мелі спэцыяльную форму і рознакаляровыя павязкі на рукавах адзеньня. Кіраўнікі налёту пры складаньні пляну захвату чыгункі, забылі, аднак, прадугледзець матывіроўку сваіх дзеяньняў. Толькі ў момант захвату яны апомніліся і тут жа сфабрыкавалі абвінавачаньне супроць савецкіх грамадзян. Работу ўсіх грамадзкіх арганізацый савецкіх калёній на К.-Усх. чыг. яны абвясьцілі антыкітайскай. Нават замежны друк у Манчжурыі лічыць гэтыя абвінавачаньні неўгрунтаванымі. Захват К.-Усх. чыг. гэта заключны акорд агрэсіўнай палітыкі кітайскіх генэралаў у адносінах да СССР за апошнія 3-4 гады.

Што зроблена савецкай уладай для К.-Усх. чыгункі

ГУТАРКА З ТАВ. КІРАЎНІКА К. УСХ. ЧЫГ. ІНЖЫНЭРАМ ЭЙСМАНТАМ

Да нашага прыходу на К. Усх. чыг. фінансавае становішча чыгункі было вельмі цяжкім. Крэдыт быў зусім падарваны. Агульная запазычанасьць чыгункі дасягала 15 мільёнаў рублёў. Нават пэнсія служачым выплачвалася з вялікім спазьненьнем. Гаспадарка чыгункі была ў дрэнным становішчы. За 5 год нашай работы на К. Усх. чыгунцы і супольнага з Кітаем кіраваньня чыгункай фінансавая запазычанасьць была хутка пакрыта і крэдыт поўнасьцю аднаўлены. Гаспадарка чыгункі значна палепшылася. Колькасьць пасажырскіх перавозак павялічылася ў тры разы, грузавых у два разы. Асабліва пасьпяхова праходзілі работы па арганізацыі эўрапэйска-азіяцкіх простых чыгуначных зносін. За час супольнай работы на К. Усх. чыг. быў значна палепшаны быт рабочых і служачых. Было пабудавана некалькі дзесяткаў школ як для дзяцей савецкіх грамадзян, так і для кітайцаў. Значнае разьвіцьцё атрымалі існаваўшыя рабочыя клюбы, а таксама былі пабудаваны новыя на ўсіх буйных станцыях. Значна пашырылася жыльлёвае будаўніцтва для рабочых і дробных служачых, як у Харбіне, так і на лініі.

За апошнія два гады была ўзмоцнена работа агранома ў, арганізаваны трактарны атрад і заснаваны пракатныя пункты для водпуску бяднейшым кітайскім земляробам с.-г. машын на ільготных умовах. На К. Усх. чыг. было 27-25 тысяч рабочых і служачых, з якіх паловы савецкія грамадзяне. На 150 тысяч расійскага насельніцтва ў Харбіне толькі 50-60 тысяч грамадзяне СССР, рэшта—белагвардзейцы. Нас праважалі тысячныя натоўпы рабочых чыгуначных майстэрань, дэпо і ня гледзячы на вялікія нарады кітайскай паліцыі і белагвардзейцаў ім удалося прарвацца да нашых вагонаў і вітаць нас.

АД'ЕЗД САВЕЦКАГА КОНСУЛЬСТВА З ДАЙРЭНУ

ПЭЙПІН, 20. Савецкае консульства ў Пэйпіне рыхтуецца да ад'езду ў Дайрэн, каб адтуль накіравацца ў СССР.

ЗЬЕЗД ЛЯВІЦЫ ППС

ВАРШАВА, 21. 20-га ліпеня ў Варшаве адкрыўся 1-шы агульна-краявы зьезд ППС-лявіцы. Зьезд зьбіраецца ў цяжкі для партыі момант, калі высьвятлілася, што рад выдатных дзеячоў партыі здрадзілі ёй і перайшлі ў лягер фашызму. Адзін з гэтых дзеячоў, Чума нават абвешчаны правакатарам. Напярэдадні зьезду паліцыя арыштавала варшаўскі камітэт лявіцы ППС. Увечары, за дзень да адкрыцьця зьезду група прыхільнікі лявіцы ППС, але была выведзена рабочымі, якія знаходзіліся ў суседнім памяшканьні прафсаюзаў і якія прышлі на дапамогу.

На зьезд прыбылі 190 дэлегатаў, якія прадстаўляюць 130 арганізацый. У парадку дня рад важных палітычных і арганізацыйных пытаньняў. З пытаньнямі на зьездзе выступілі прадстаўнік камуністычнай фракцыі сойму Сыпула, прадстаўнік салянскай самадапамогі, прафсаюзных арганізацый і буйных фабрык. Усе выступаўшыя ганьбілі здрадлікаў і правакатара Чуму.

Да захвату Кітайска-Усходняй чыгункі

Будынак прафарганізацыі К.-Усх. чыгункі ў Харбіне, разгромлены кітайскай ваеншчынай.

Нямецкая экспэртыза аб судаходзтве на Волзе

МЕРАПРЫЕМСТВЫ НКЗШ ПА ЛЯПШЭНЬНІ СУДАХОДНЫХ УМОЎ ВОЛГІ—ЗУСІМ ПРАВІЛЬНЫЯ

19-га ліпеня ў Маскву вярнуўся прадстаўнік НКШЗ начальнік «Цуводпути» тав. Лепін, які разам з нямецкай экспэртнай камісіяй браў удзел у апошняй паездцы па Волзе. Аб выніках работы нямецкай экспэртызы тав. Лепін ў гутарцы з нашым супрацоўнікам заявіў:

— Карыстаючыся прыездам нямецкай экспэртнай камісіі па Волга-Дону НКШЗ прызнаў мэтазгодным скарыстаць практыку і веды нямецкіх спэцыялістых для таго, каб яны далі сваё **заключэньне па радзе буйнейшых работ, што адбываюцца на Волзе і маюць мэтаю палепшыць волскія судаходныя ўмовы.**

Усе бяз выключэньня члены экспэртызы **зьдзіўлены магутным грузавым і пасажырскім рухам на Волзе, а таксама станам водных шляхоў зносін;** арганізацыяй судаходзтва і станам водных шляхоў.

Нямецкія экспэрты наведалі ўсе краявыя і абласныя цэнтры Паволожжа, агледзелі Балахінскі папяровы камбінат і буйнейшы трактарны завод, які будуецца ў Сталінградзе. Акрамя нямецкія экспэрты сустракаліся гарачы прыём з боку мясцовых арганізацый. З свайго боку яны катэгарычна абяцалі аказаць максымальную тэхнічную дапамогу савецкаму будаўніцтву.

Пасьля дакладнага азнаямленьня з праектам Ніжагародзкага рэчнага порту і з месцам вызначэньня запраектаваных пабудоў **экспэртыза выказалася супроць першачарговасьці пабудовы Мяшчэрскай гавані з прычыны яе дарагоўлі і нязручнасьці для перагрузачных апэрацый. Экспэртыза зусім ухваліла прыняты «Цуводпутем» і Вольскім параходзтвам праект стварэньня ў першую чаргу Молітоўскай гавані з адкрытай прычальнай лініяй і з затонам для зімоўкі флёту.**

У Астрахані нямецкая экспэртыза выяжджала на адкрыты 12-ці футавы рэйд, падрабязна азнаёмілася са становішчам на мясцох, выслухала даклад

Лёзунгі да Міжнароднага Чырвонага Дня

1. 15 год назад імпэрыялістыя распалілі вайну. Мільёны рабочых і сялян загінулі. Народныя масы былі даведзены да жабрацтва і разбурэньня. Пралетары і прыгнечаныя ўсяго сьвету, на рэвалюцыйную барацьбу супроць новай імпэрыялістычнай вайны!

2. Няхай жыве Камінтэрн — штаб сусьветнага пралетарыяту ў барацьбе супроць вайны — за пралетарскую рэвалюцыю, супроць капіталізму — за сацыялізм!

3. Імпэрыялістыя рыхтуюць новую сусьветную вайну для ўмацаваньня імпэрыялістычнага рабства.

Пралетары, станавецеся пад сьцяг Камінтэрну — на барацьбу за зьвяржэньне капіталізму!

4. У адказ на ўзрастаючы ўздым міжнароднага рэвалюцыйнага руху буржуазія рыхтуе вайну супроць Савецкага Саюзу — апоры пралетэрскай рэвалюцыі.

Усе на барацьбу супроць імпэрыялістычнай вайны, на абарону СССР!

5. Імпэрыялістыя ў саюзе з сацыял-дэмакратыяй рыхтуюць контр-рэвалюцыйную вайну супроць СССР.

Прэч арганізатараў вайны! Няхай жыве Камінтэрн!

6. Прэч правакатараў новай вайны — кітайскіх мілітарыстых, агентаў сусьветнага імпэрыялізму!

Няхай жыве рэвалюцыйны саюз рабочых і сялян Кітая і СССР!

7. У адказ на бандыцкі набег кітайскіх генэралаў і белагвардэйцаў умацуем абарону СССР і братэрскі саюз савецкіх і кітайскіх рабочых і сялян.

8. Панская Польшча і баярская Румынія ўзбройваюцца пры падтрыманьні міжнароднага імпэрыялізму супроць СССР.

Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба рабочых і сялян Польшчы і Румыніі супроць імпэрыялістых!

9. Урад Макданальда — верны прыказчык імпэрыялізму. Прэч маскі з прыслужнікаў буржуазіі! Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба ангельскага пралетарыяту!

10. Левыя сацыял-дэмакраты пацыфісцкімі словамі дапамагаюць буржуазіі ашукваць рабочых і арганізаваць новую вайну! На барацьбу з сацыял-дэмакратыяй!

11. Чацьвертага жніўня сацыял-імпэрыялістыя дэманструюць вернасьць свайму саюзу з буржуазіяй, мабілізуюць сілы для новай імпэрыялістычнай вайны.

Першага жніўня пралетары выступаюць пад сьцягам Камінтэрну на барацьбу з імпэрыялістычнай вайной, на барацьбу з імпэрыялізмам!

12. Першага жніўня — дзень мабілізацыі рэвалюцыйных сіл сусьветнага пралетарыяту супроць новай імпэрыялістычнай вайны, супроць буржуазіі і яе прыслужнікаў — сацыял-дэмакратаў.

13. Няхай жыве Міжнародны Чырвоны Дзень — баявы агляд сіл сусьветнага пралетарыяту для барацьбы з імпэрыялізмам, з ваеннай небясьпекай, для абароны СССР — бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту!

14. Словамі аб міры, балбатнёй аб разбраеньні, фальшывым пактам Келёга буржуазія і сацыял-дэмакраты хочуць заглушыць ляск узрастаючых узбраеньняў. Прэч буржуазны пацыфізм! Прэч Лігу Нацый — прыладу падрыхтоўкі новай вайны!

15. Братэрскае прывітаньне гэраічным пралетарам Бэрліну, мужным абаронцам барыкад Нэйкельна і Вэдынгу. Цьвёрдай баявой рады вакол сьцягу рэвалюцыйнага Інтэрнацыяналу!

16. На варшаўскі зьезд пілсудчыкі пабаяліся пусьціць савецкіх дэлегатаў. Няхай жыве баявое братэрскае адзінства рэвалюцыйных рабочых і сялян Польшчы і СССР супроць фашызму, супроць імпэрыялізму!

17. Гарачае прывітаньне забастоўшчыкам Бамбэю. Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба за зьвяржэньне прыгнечаньня імпэрыялізму ў калёніях, няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!

18. Толькі перамога пралетарыяту ва ўсім сьвеце пакладзе канец імпэрыялістычным войнам. Пралетары ўсіх краін, рыхтуйцеся ператварыць вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую!

Няхай жыве савецкая ўлада ва ўсім сьвеце!

19. Пралетарыят узбройваецца, каб абязброіць буржуазію. Няхай жыве ўзброенае паўстаньне рабочых і прыгнечаных народаў супроць улады капіталу!

20. Прыгнечаныя народы калёній, пад кіраўніцтвам пралетарыяту на барацьбу за зьвяржэньне імпэрыялістычнага ярма!

21. Няхай жыве баявы саюз рабочае клясы з прыгнечанымі і эксплёатуемымі ва ўсім сьвеце!

22. Рэвалюцыйныя пралетары — паражэнцы ў капіталістычнай дзяржаве, рэвалюцыйныя пралетары — за абарону СССР, сацыялістычнай бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету!

23. Няхай жыве Чырвоная армія — узброены атрад сусьветнага пралетарыяту!

24. Чырвоная армія — меч прыгнечаных, зброя пралетарскай рэвалюцыі. Няхай жыве Чырвоная армія!

25. Кожны посьпех рабочых і сялян у сацыялістычным будаўніцтве — новы крок ва ўмацаваньні абароназдольнасьці СССР, новы ўдар па сусьветным капіталізьме. Няхай жыве Савецкі Саюз—бацькаўшчына міжнароднага пралетарыяту!

26. Напруженым тэмпам нашага будаўніцтва — зробім непераможнай савецкую краіну ў барацьбе з сусьветным капіталам. На рашучую барацьбу за перамогу сацыялізму!

27. Наша будаўніцтва сацыялізму — частка сусьветнай рэвалюцыйнай барацьбы. Вышэй дысцыпліну, больш арганізаванасьці ў працы! Усе на сацыялістычнае спаборніцтва!

28. За індустрыялізацыю краіны, за ўздым і калектывізацыю сельскае гаспадаркі. Ажыцьцёвім пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва. Разгорнем сацыялістычнае наступленьне ў горадзе і вёсцы!

29. Індустрыялізацыя нашай краіны, калектывізацыя савецкай вёскі, галоўны шлях умацаваньня абароназдольнасьці СССР.

30. У саюзе і пад кіраўніцтвам пралетарыяту беднякі і серадняки вёскі дадуць адпор сусьветнаму імпэрыялізму. Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

31. Кулаком і нэпманам, дэзарганізатарам гаспадаркі і шкоднікам, усім клясавым ворагам адкажам моцным наступленьнем пралетарыяту. Умацуем Чырвоную армію, разгорнем пераможнае будаўніцтва сацыялізму!

32. Агнём рабочай самакрытыкі выпалім язву бюракратызму. Чыстнай апарату ад клясавых ворагаў умацуем сацыялістычнае будаўніцтва, узмоцнім абарону Савецкага Саюзу!

33. Магутным уздымам культуры, навукі і тэхнікі забясьпечым пяцігадовы плян будаўніцтва сацыялізму, ператварым СССР у непераможную крэпасьць сусьветнай рэвалюцыі.

34. Гультай і прагулышчык, спекулянт і бюракрат зрываюць наша сацыялістычнае будаўніцтва, дапамагаюць імпэрыялістым, якія рыхтуюць напад на СССР.

35. Перад тварам узрастаючай ваеннай небясьпекі — вышэй сьцяг баявога інтэрнацыяналізму рабочых і ўсіх працоўных СССР!

36. Рашучы адпор апартунізму. Бязьлітасная барацьба з правымі і прымірэнцамі — дэзэртырамі з рэвалюцыйнага фронту. Няхай жыве ленінскае адзінства радоў УсеКП(б) і Камінтэрну!

37. Трацкістыя — у адным лягеры з контр-рэвалюцыяй, супроць Камінтэрну, супроць СССР. Бязьлітасная барацьба са здрадніками справе пралетарыяту!

38. Энтузіязмам мас у сацыялістычным спаборніцтве скончым сацыялістычную будоўлю, забясьпечым перамогу сацыялізму!

39. Ленінскі камсамол, арганізатар баявых атрадаў рабочай моладзі, будзе змагацца ў першых радох сьмяртэльных ворагаў імпэрыялізму. Няхай жыве ленінскі камсамол!

40. Работніцы і сялянкі, на абарону сацыялістычнай краіны, на барацьбу за рэвалюцыйнае зьвяржэньне імпэрыялізму!

41. Вышэй сьцяг Камінтэрну, арганізатара сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі. Рабочыя, сяляне і прыгнечаныя ўсяго сьвету, згуртоўвайцеся вакол Камінтэрну!

42. Уся гэраічная працоўная практыка рабочых і сялян СССР пацьвярджае непахісную правату ленінскай палітыкі УсеКП(б). Няхай жыве УсеКП(б), арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

ЦК УсеКП(б).

СПРАВЫ І ЛЮДЗІ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б ДЗЯРЖСТРАХУ

ЗАЖЫМ САМАКРЫТЫКІ, ЗАМАЗВАНЬНЕ ХВАРАВІТЫХ ЗЬЯВІШЧ, ПАТУРАНЬНЕ БЮРАКРАТАМ, БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ, КАНКРЭТНАЕ ПРАЯУЛЕНЬНЕ ПРАВАГА УХІЛУ, АДСУТНАСЬЦЬ ЯКОЙ-БЫ ТА НЯ БЫЛО МАСАВА-ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ —ЗАМЕСТ ВЫРАЗНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПАРТДЫРЭКТЫЎ

Ячэйка Дзяржстраху павінна праходзіць чыстку ў першую чаргу

„Усё добра"

Пятнаццаць дзён правярала камісія Фрунзаўскага райкому партыі працу ячэйкі Дзяржстраху. На працягу пятнаццаці дзён камісія зьвярталася да бюро і асобных яго членаў, кажны яны расказалі аб сапраўдным становішчы ячэйкі... і на працягу ўсяго часу бюро адказвала:

— Усё добра! — Няма ніякага важыму — заяўлялі члены бюро **Чарнушэвіч, Чарняўскі, Разьдзёраў** і сакратар ячэйкі **Ельяшэвіч.**

— Я аб кепскім у рабоце ячэйкі ня ведаю, і каб было кепска, я-б рэагаваў—так на працягу цэлай гадзіны запэўняў член камісіі былы сакратар ячэйкі тав. Дзяргач *).

— «Зьвязда» зьмясьціла матар'ялы аб ячэйцы, якія на 90 проц. не адпавядаюць сапраўднасьці — в абурэньнем заяўлялі тыя, каго выкрыла «Зьвязда».

—Паклёпы льле на ўстанову і ячэйкі рабочая брыгада па садзейнічаньні чыстцы апарату Дзяржстраху і, наогул, усе на нас! — крычалі зажымшчыкі самакрытыкі.

Бязумоўна, што пры такім становішчы было вельмі цяжка камісіі працаваць. На старонках «Зьвязды», якая першая сыгналізавала небясьпеку, чытач зараз зможа азнаёміцца з сапраўдным становішчам ячэйкі.

— Адступленьняў ад генэральнай лініі партыі ў ячэйцы няма. Ухілаў, зажымаў і бюракратызму таксама! Наогул няма... Няма... і няма. Усё добра!?

Рэвалюцыя, якая толькі два месяцы таму назад была прынята на справаздачы ячэйкі, па думцы бюро правільная, бо ўсё добра, а па думцы камісіі і райкому партыі амаль ні ў водным пункце не адпавядае сапраўднасьці.

Тры разы камісія імкнулася дагаварыцца з бюро ячэйкі, каб высьветліць сапраўдны стан ячэйкі, і ўсе тры разы яна атрымала рашучы адказ: «Усё добра».

Нават на бюро райкому, калі прышла большасьць ячэйкі, прысутнічала камісія па праверцы работы, брыгада па садзейнічаньні чыстцы апарату, старшыня камісіі па чыстцы апарату і старшыня ЦП саўгандальслужачых, і тут сакратар ячэйкі ў сваім справаздачным дакладзе, гэтак як і ўсё бюро, імкнуўся скрыць фактычнае становішча ячэйкі. — Усё добра! — гаварыла бюро і на райкоме.

Глушыцелі самакрытыкі

Ашчэ ў мінулым годзе бюро Ляхаўскага райкому партыі канстатавала зажым самакрытыкі, ашчэ ў мінулым годзе яно зрабіла арг. вывады ў адносінах відомага ва ўстанове важымшчыка і п'яніцы **Русовіча.** А **Русовіч** пад крылом бюро ячэйкі ня спыняў рабіць сваю справу, глушыў самакрытыку. Яго, і толькі яго, а ня іншага, бюро вылучыла на работу па «разгортваньні» самакрытыкі ў якасьці старшыні рэдкалегіі насьценгазэты. Пачалася «крытыка» і «самакрытыка» па Русовічу. Допіс «Пытаньні і адказы», у якой крытыкавалі супрацаўнікоў Дзяржстраху, старшыня рэдкалегіі **Русовіч** перакрэсьлівае і кладзе рэзалюцыю **«мне здаецца, што гэты матар'ял зьмяшчаць ня варта, бо ад яго нясе цкаваньнем супроць тав. Чарняўскага».**

На допісе «Няма паратунку» **Русовіч** піша такую рэзалюцыю «дозволу на зьмяшчэньне заметкі ў насьценгазэце не даваў, таму здымаю в сябе адказнасьць за яе сапраўднасьць, а па другое — лічу ігнараваньнем маёй асобы, як старшыні рэдкалегіі, а таму адмаўляюся яе зьмяшчаць і лічу, што яна ня пройдзе».

Калі быў напісаны допіс, што падхалім в каапэрацыйнае камісіі **Сярмяжка** насіў дамоў жонцы **Чарнушэвіча** квіток на шэрсьць, дык яна была так падана, нібы ніякага падхалімства ня было. Чаму зараз гэты падхалім **Сярмяжка** высунуты на больш адказную працу, ня гледзячы на тое, што па пытаньні яго вылучэньня на мясцкоме падзяліліся галасы, — нам не вядома?

Супрацоўніца Дзяржстраху **Васільева** пры чыстцы апарату Дзяржстраху расказала аб тым, як **Русовіч, Куніцкі, Лебядзяў і Багданаў** п'янствавалі, і як Русовіч прымушаў супрацоўніц Дзяржстраху мець з ім інтымную сувязь.

А бюро ячэйкі дзе было?

Бюро ячэйкі, бачыце «ня ведала» нічога, а калі і ведала, дык не жадала «крыўдзіць актывістых». Бюро ячэйкі ў гэты час праз мясцком і такіх «актывістых», як Русовіч і Боранаў, працягвала рабіць сваю справу. Яно глушыла самакрытыку іншым парадкам. Спытайцеся вы, калі ласка, у члена бюро ячэйкі, старшыні мясцкому Чарняўскага аб супрацоўніках, і ён вам адкажа—«Усе чыноўнікі, усе контр-рэвалюцыянэры».

Вось дык навіна?! Падумаць толькі На дванаццатым годзе рэвалюцыі падая ўстанова контр-рэвалюцыянэраў!

Аб аднэй, праўда, справе расказаў аднойчы Чарняўскі: «Калі-б яны (супрацоўнікі) ведалі, як я іх ненавіжу, дык не абіралі-б мяне старшынёю мясцкому».

А апорг ячэйкі? Апорг лічыць, што масавую работу сярод супрацоўнікаў нельга праводзіць таму, што ўсе яны «чыноўнікі, якія закасьцянела глядзяць на гэта».

Вы правы тав. **Разьдзёраў,** абы як на ўсё глядзяць амаль усе супрацоўнікі. І глядзелі-б абы як яшчэ, каб Фрунзаўскі райком ня ўзяўся за праверку работы ячэйкі. І як-жа не глядзець закасьцянела, калі актыўную групу супрацоўнікаў, якая заўсёды выступала з здаровай крытыкай работы мясцкому, пры дапамозе якой быў распушчаны бюракратычны мясцком і распушчаецца зараз новаабраны, зажалі так, што адна супрацоўніца пала ахвярою скарачэньня, а другую, першую па сьпісу прызначылі да чысткі апарату.

Спытайцеся вы ў сакратара ячэйкі Ельяшэвіча, чаму стаіць пытаньне аб звальненьні супрацоўніцы **Сьвідоўскай** і ён вам адкажа: «Сьвідоўская складае навакол сябе групоўкі і нацкоўвае іх супроць кіруючых органаў». Прыводзіць прыклад, што калі абгаворвалі вывады аб працы мясцкому, то супрацоўнікі па ініцыятыве Сьвідоўскай выступалі в крытыкай і давалі новыя прапановы ў далейшай рабоце.

Так разумее Ельяшэвіч самакрытыку, і гэта на яго думцы не зажым. Толькі дзякуючы крытыцы, Сьвідоўская намечана да чысткі апарату першай па сьпісу ў той час, калі ёсьць такія сапраўдныя чыноўнікі, бюракраты, былыя людзі як Касьпяровіч, аб якім ужо пісала «Зьвязда». Сьвідоўская актывістка, яна за час работы ў Мазырскім Ц.Р.К. в 16 кастрычніка па 1 студзеня 1925 г., была сакратаром і касірам ЦРК і выконвала гэту работу сумленна і акуратна. Яна в 1922 г. па 8 лістапада 1924 г. была прафупаўнаважаным калектыву служачых Мазырскага ЦРК, а в 8 лістапада па 30 мая 1925 г. была старшынёю камслужу ЦРК.

Прачытайце вы ўсе водгукі аб грамадзкай рабоце Сьвідоўскай і тады будзе зразумела, што яна прызначана да чысткі апарату першай па сьпісу не як чужы нам элемэнт, а як ахвяра самакрытыкі.

А **Бэйліну** чаму скарацілі? Бэйліна, бачыце, шовіністка. Хай так, але-ж чаму яе паслаў зноў на работу і саюз, і суд?

Аб гэтым таварышы в бюро ціха скажуць:

Бэйліна звольнена за самакрытыку.

— А тав. **Гінзбург,**—сакратара праўленьня ЦП саўгандальслужачых, члена ячэйкі Дзяржстраху бюро не прыцяпнула? Прыцяпнула. А за што? За тое, што яна на нарадзе сакратароў ячэек пры райкоме выступіла в крытыкай падрыхтоўкі да чысткі апарату Дзяржстраху. Яе на заўтра на бюро ячэйкі **Чарнушэвіч, Ельяшэвіч і Чарняўскі** «ўзялі ў работу» і занесьлі спэцыяльным пунктам у пратакол пастанову «Лічыць, што выступленьне тав. Гінзбурга на нарадзе сакратароў пры райкоме не адпавядае сапраўднасьці».

А што т. **Фішэр** заявіў камісіі?

— Ёсьць цыгат аб чым сказаць, але-ж не хачу лезьці ў бруднае балота.

А т. **Шівабоўскі** што заявіў?

— Я маўчаў таму, што сямейны і баяўся, каб не скарацілі.

І гэта па думцы бюро не зажым. Гэта па іх думцы звычайнае зьявішча.

Затое ня былі зажаты адмысловыя бюракраты, п'яніцы і антысэміты. Хто, калі ня бюро ячэйкі выдала станоўчую характарыстыку—антысэміту, бюракрату, члену партыі, які выяўляе хістаньні Боранаву? І гэта ўсё робіцца як раз напярэдадні самой чысткі.

„Бюракратаў і п'яніц у нас няма"

Калі па справаздачы бюро ячэйкі некаторыя таварышы імкнуліся ўнесьці ў рэзалюцыю пункт аб фактах бюракратызму, цяганіне і кепскай пастаноўцы працдысцыпліны, дык іх прапановы былі адхілены. Ды як-жа можна ўнесьці такі пункт, калі самых членаў бюро ў гэтым абвінавачваюць?

Ці-ж ня сам Чарняўскі, член бюро, **марнаваў 5 месяцаў адносіну страхагента аб высылцы яму кажуха, а на 6-м** месяцы Чарняўскі накладае рэзалюцыю: «Кажухоў ў Менску няма, паехалі ў Маскву купляць і на гэтым лічу нашу з вамі перапіску скончанай». І ці-ж ня сам сакратар ячэйкі Ельяшэвіч, які займае пасаду сакратара праўленьня, трымаў у сваім габінэце 2-х супрацоўнікаў: Шамо і Васільлеву ў часе працы на і гадз. 50 хвілін, каб разабраць допіс, зьмешчаны ў газэце.

А што адносна працоўнай дысцыпліны думае кіраўнік установы т. Чарнушэвіч? Ён лічыць, што допісы ў насьценгазэту можна пісаць і ў часе працы, бо гэта залежыць ад натхненьня.

Ці-ж ні вам, т. Дзяргач, як былому сакратару ячэйкі, гаварылі аб тым, што **Чарняўскі** часта прыходзіць п'яны дамоў? А вы што рабілі?

Ведаючы аб тым, што асобныя камуністыя п'янствуюць, бюро ячэйкі ніводнаго разу не займалася гэтым пытаньнем. Яно ніводнаго разу не выклікала на свае пасяджэньне тых таварышоў, якія былі заўважаны п'янымі.

Вы на гэта, як і на іншыя антыпартыйныя зьявішчы, не рэагавалі. Вы замазвалі, вы, як сакратар ячэйкі, які не рэагаваў на працягу ўсяго часу свайго сакратарства на розныя хваравітыя зьявішчы, давялі ячэйку да такога становішча.

Камандыроўка на 114 дзён

Хоць і імкнуўся даказаць т. **Чарнушэвіч,** што камандыроўка ў Віцебскі акрстрах з рэвізораў у агульнай складанасьці на 114 дзён, рэч была патрэбная, але-ж в гэтым згадзіцца нельга. Што значыць рэвізія акрстраху на працягу 114 дзён в выдаткаваньнем для гэтае мэты 1.250 руб.? Безгаспадарчасьць! Так, у Віцебскім акрстраху былі «дела», —выяўлена растрата на суму каля 2.000 рублёў, але-ж і пры гэтых умовах рэвізію трэба было рабіць куды менш, як 114 дзён.

А спэцыяльная пасада па абслугоўваньні 15 беспрацоўных гарантыйных служачых па 85 руб.—гэта не безгаспадарчасьць? Так, безгаспадарчасьць! А зараз і зусім ніводнага беспрацоўнага гарантыйнага служачага няма, а 85 руб. выдаецца. А гнілыя кажухі на 6.000 рублёў? Таксама безгаспадарчасьць! Праўда, за кажухі адміністрацыя сама сябе аддала пад суд, але-ж калі? Толькі тады, калі быў зьмешчаны артыкул у насьценгазэце.

А запазычанасьці і растраты, як сьпісваліся? Сьпісваліся без праверкі фактаў. Сьпісваліся в матывыроўкаю «невядома дзе знаходзіцца», у тэй час, як некаторыя в даўжнікоў знаходзяцца ў Менску. А ці ня быў такі факт, што сьпісалі на падставе: «невядома дзе знаходзіцца», а гэты самы супрацоўнік Харытон, сам-жа прыслаў адносіну, каб выслаць яму характарыстыку аб яго рабоце на адрасу, дзе ён зараз знаходзіцца.

Характарыстыкі бяз фактаў

— Ставіліся даклады пра чыстку, пісаліся ў насьценгазэту допісы і, наогул, рабілася усё магчымае, каб падрыхтаваць да чысткі—так дакладваў сакратар ячэйкі райкому, але-ж ён галоўнае забыў. Забыўся сказаць пра тое, як ячэйка практычна ні ў чым не дапамагла рабочай брыгадзе і камісіі па чыстцы. Праверце вы складэньня на супрацоўнікаў характарыстыкі, і вам будзе адразу зразумела, што ячэйка ня імкнулася дапамагчы камісіі па чыстцы. Ва ўсіх характарыстыках на супрацоўнікаў вы знойдзеце фразы: «антысэміт, антысавецкі настроен, чыноўнік, бюракрат, фармалісты і г. д.». А факты. Пра факты, бачыце, забылі. Іх, па думцы сакратара ячэйкі, вельмі цяжка знайсьці.

Ня лепш абстаіць справа і в падрыхтоўкай да чысткі партыі. Яна акрамя агульных дакладаў і разважаньняў па гэтым пытаньні, практычнага нічога не зрабіла.

Ніводнага вылучэнца

З 62 супрацоўнікаў апарату Дзяржстраху ніводнага рабочага, ніводнага вылучэнца. Ячэйка ня цікавілася гэтым пытаньнем, а кіраўнік установы на працягу 2 год «шукае» вылучэнцаў і нідзе іх не знаходзіць.

— Мне,—заяўляе **Чарнушэвіч,**—абяцалі ашчэ ў мінулым годзе даць вылучэнцаў, але-ж іх ашчэ няма.

Нам з практыкі работы вядома адно: калі ячэйка ў гэтым напрамку нешта робіць, і калі адміністрацыя сапраўды шукае вылучэнцаў, дык іх пасылаюць ва ўстановы.

Скрыўленьне клясавай лініі

— Прымаліся меры—запэўнялікамісію кіраўнікі ўстановы,—да таго, каб забясьпечыць правядзеньне клясавай лініі. У скрыўленьні клясавай лініі мы не вінаваты, а вінавата Галоўная Ўправа Дзяржстраху СССР.

Такія адказы задаволіць нас ні ў якім разе ня могуць. Мы ведаем, што на працягу ўсяго часу царква і сынагога плацяць страхоўку менш за працоўнага; мы ведаем, што ў горадзе гандляр плаціць менш за саматужніка і рабочага; мы ведаем і тое, што ў «клясавай лініі» Дзяржстраху тапіўся бадняк.

Ячэйка гэта пытаньне ніколі ня ставіла перад вышэйшымі парторганамі, а кіраўнік установы аб гэтым не даводзіў да ведама ЦК КП(б)В.

Праўда, за апошні час ячэйка нешта пачала рабіць, але-ж работы ня відаць.

Вось што аб клясавай лініі Дзяржстраху расказвае страхагент Лупалаўскага раёну, Магілеўскай акругі, т. Беленькі:

— Ні ў воднай дырэктыве Дзяржстраху няма ні слова аб клясавым падыходзе ў працы. Няма ніякіх дыфэрэнцыяцый у тарыфах. Так, напрыклад, на хутарох за страхоўку будынкаў па звышакладным бярэцца рубель в сотні, а па вёсцы паўтара рублі, пры чым няма ніякіх дыфэрэнцыяцый ў адносінах заможных сялян вёскі і хутара.

Антысэміты з партбілетамі

— Выяўленых антысэмітаў няма, — заяўляла на працягу ўсяго часу бюро ячэйкі, і ў гэты-ж самы час бюро ў кожнай характарыстыцы супрацоўнікаў да чысткі апарату піша—«антысэміт».

Так, выяўленых антысэмітаў сярод беспартыйных мабыць няма, але-ж за то ёсьць яны сярод камуністых, аб якіх бюро маўчала. Прыпомнім факты: член партыі **Воранаў** на пасяджэньні бюро ячэйкі заявіў «я в арміі выйсьці не змагу, таму што я не яўрэй». Член партыі Русовіч кажа беспартыйнаму супрацоўніку: «Паяжджай жаніцца ў мясцэчка да Хаячкі, бо ў яе даляры ёсьць», Супрацоўнік Стравус заявіў Бэйліну—«мы вас звальняем таму, што ў яўрэяў шмат грошай». І гэта па думцы бюро не антысэмітызм.

Ёсьць і шавінізм. І пры наяўнасьці ўсяго гэтага інтэрнацыянальнае выхаваньне адсутнічала.

* * *

Зажым самакрытыкі, замазваньне недаробных зьявішч, скажэньні клясавай лініі, бюракратызм і інш.—выявіла камісія там, дзе па думцы ячэйкі было усё добра.

І горш за ўсё тое, што нават пасьля пастановы бюро райкому аб роспуску бюро ячэйкі і вымовы ўсяму складу бюро за такое становішча ў ячэйцы, бюро ня прызнала сваёй памылкі. Раённы камітэт партыі пастанавіў: **Прасіць АКК намеціць ячэйку Дзяржстраху да чысткі партыі ў першую чаргу».** Гэта просьба РК павінна быць задаволена як мага хутчэй. Ячэйку трэба зараз-жа аздаравіць. Трэба арабочыць ячэйку і апарат і выправіць усе памылкі, што мелі месца да гэтых дзён.

Міх. ШМІДТ.

Дзеці рабочых павінны ведаць аб зьлёце

Арганізуем масавую вылазку піянэрскіх атрадаў на рабочыя акраіны

Тэрмін усебеларускага піянэрскага зьлёту набліжаецца. Можна загадзя сказаць, што посьпех зьлёту будзе вызначацца ўдзелам усёй савецкай грамадзкасьці, наколькі ўсе працоўныя прымуць ўдзел у падрыхтоўцы зьлёту, наколькі будзе зроблена пералом у сэнсе ўвагі да дзяцей.

Зьлёт—гэта ня толькі піянэрская справа, а справа ўсёй пралетарскай дзетвары, савецкай грамадзкасьці. Толькі пры гэтых умовах зьлёты гарантуюць нам посьпехі.

Таму неабходна зараз-жа праверыць, што зроблена для шырокага наведамленьня ўсіх піянэраў, усіх дзяцей рабочых аб зьлёце, аб яго значэньні і задачах. Як арганізавана і праводзіцца масавая праца сярод рабочых, іх дзяцей для таго, каб задачы, ідэі зьлёту зрабіць блізкімі для іх? Ці скарысталі мы ўсе магчымасьці для шырокай прапаганды задач зьлёту?

Непамылковым будзе, калі скажам: ашчэ ня ўсё зроблена для папулярызацыі піянэрскага зьлёту сярод усіх рабочых, сярод масы неарганізаванай дзетвары. Вельмі мала ашчэ зроблена. Але-ж пачын ужо зроблены.

Піянэрская агітгрупа, атрады Белдзяржстраху арганізавалі калектыўнае выступленьне на рабочых сходах раду заводаў Менску (завод «Бальшавік», «Чырв. Зорка»). Агітгрупа таксама выступіла на сходзе партактыву, дзе сустрэла падтрыманьне. Гэтую ініцыятыву агітгрупы трэба зрабіць больш масавай.

Ці-ж нельга ў часе абедзенага перапынку на ўсіх фабрыках і заводах наладзіць лятучыя мітынгі, дзе арганізаваць кароткія выступленьні дзяцей аб зьлёце, аб неабходнасьці разьмяшчэньня дэлегатаў па кватэрах рабочых, і тут-жа арганізаваць рабочых, якія жадаюць ўзяць дэлегатаў усебеларускага зьлёту?

Ці-ж нельга скарыстаць правадзімыя рабочыя сходы, партыйныя і камсамольскія сходы для кароткага азнаямленьня дзяцей аб зьлёце і для падачы канкрэтных прапаноў аб дапамозе ў рабоце да зьлёту?

Ці-ж нельга піянэрскаму атраду і ў савецкіх установах наладзіць кароткі лятучы мітынг (выйсьці усім атрадам з барабанным боем), дзе выступіць аб зьлёце?

Ці-ж нельга заводзкія газэты скарыстаць для высьвятленьня ў іх пытаньня зьлёту, праверкі работы грамадзкіх арганізацый аб дапамозе камсамолу ў камуністычным выхаваньні дзяцей?

Усё гэта можна і трэба зрабіць. Неабходна прапаганду задач зьлёту зрабіць масавай, неабходна папоўніць упушчанае.

Мы прапануем да пачатку ўсебеларускага зьлёту, у летнім тэатры, садзе «Прафінтэрн», у кіно-тэатр «Культура», Белдзяржтэатры **штодзённа перад пачаткам спэктакляў, сэансаў арганізоўваць 10-ці хвілінныя калектыўныя выступленьні агітгрупы піянэраў па пытаньнях аб значэньні і задачах зьлёту.**

Мы прапануем ва ўсіх рабочых садох, клюбах, па сходах, вечарох, якія будуць у гэты час адбывацца, арганізаваць калектыўныя выступленьні дзяцей аб зьлёце. У нашай прапагандзе аб зьлёце мы павінны мець падтрыманьне ўсіх прафарганізацый. Мы павінны ва што-б там ні стала арганізаваць масавую работу **так, каб усе працоўныя ведалі аб зьлёце. Гэта будзе гаварыць аб нашай гібкасьці.**

Мы ашчэ раз падкрэсьліваем, што мы вельмі мала робім для прапаганды ідэй і задач зьлёту **сярод усіх дзяцей працоўных** (арганізацыя дзіцячых сходаў, канфэрэнцый, арганізацыя лятучых мітынгаў у дварох, ЖАКТ'ах, вуліцах) і для забясьпячэньня ўдзелу неарганізаваных дзяцей ў зьлёце.

Трэба арганізаваць масавыя мерапрыемствы для прапаганды зьлёту. Можна ў адзін з дзён да зьлёту арганізаваць масавы паход усіх атрадаў па дварох, па вуліцах в плякатамі, лёзунгамі, якія напамінаюць аб зьлёце. Прыступіць да ўпрыгожаньня рабочых клюбаў, садоў, тэатраў акаляючых вуліц лёзунгамі і плякатамі аб зьлёце неабходна ў бліжэйшы час.

Для таго, каб неарганізаваныя дзеці ведалі, з аднаго боку аб зьлёце, а з другога—адчувалі-б грамадзка-карысную ролю піянэрскай арганізацыі, мы лічым, што неабходна ў дзень 6-га жніўня (дзень індустрыялізацыі) арганізаваць **масавую вылазку піянэрскіх атрадаў па рабочых кватэрах, ЖАКТ'ах, акраінах гораду для выяўленьня дзяцей рабочых, беднаты, неахопленых школай, якія ня могуць па тых, ці іншых прычынах (матар'яльных і іншых) наведваць школу, і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы для пасылкі іх у школу, для падрыхтоўкі іх у адпаведныя групы савецкай школы.** Асабліва трэба зьвярнуць увагу бездаглядных дзяцей, дзяцей, працуючых у саматужніках, дзяцей акраін гораду. Гэта праца зьявіцца, па нашай думцы, укладам у наша сацыялістычнае будаўніцтва і ўзмоцніць рост нашай арганізацыі за лік пралетарскай, бяднацкай дзетвары. Тое, што можна правесьці ў дзень 6-га жніўня, аб чым мы вышэй пісалі, вяўляецца толькі прыкладам. Кожны піянэрскі атрад павінен ў дзень 6-га жніўня правесьці якое-небудзь масавае мерапрыемства сярод неарганізаванай дзетвары аб зьлёце, правесьці якую-небудзь грамадзка-карысную справу сярод іх.

Ітак, шырокія масы рабочых, масы дзяцей павінны ведаць аб зьлёце, павінны быць ўцягнуты ў падрыхтоўку да зьлёту.

Але трэба памятаць, што арганізаваць масавую працу сярод рабочых і дзяцей аб зьлёце—гэта справа ня толькі піянэрскага атраду, дзіцячага актыву, вожатага атраду, але—справа ўсіх камсамольскіх, партыйных ячэек, заўкомаў.

Добра арганізаваная масавая работа сярод рабочых і ўсёй масы дзетвары—ёсьць парука пасьпяховасьці піянэрскага зьлёту.

Л. РЫВІН.

Фабрыкант вайны

Побач з ваеннай прамысловасьцю, якая вырабляе ваенныя прылады, гарматы, аэраплены, браняносцы і падводныя лодкі, ёсьць ашчэ другая, ня менш калі ня больш важная галіна ваеннай падрыхтоўкі. Гэта — выраб выбухаючых матэрыял і атрутных газаў.

У Англіі ўся гэта прамысловасьць амаль цалкам знаходзіцца ў руках аднаго чалавека. Усёй вытворчасьцю хэмічных матэрыял для ваенных мэт у Англіі кіруе Альфрэд Монд. Гэта — той самы Монд, які пры падтрыманьні меншавікоў займаўся ўстанаўленьнем «міру ў прамысловасьці».

Монд стаіць на чале вялікага «трэсту імпэрскай хэмічнай прамысловасьці» Трэст аб'яднае больш тузіну буйных фірм.

Монд, які прапаведуе «мір у прамысловасьці», мае вялікія прадпрыемствы, якія могуць выпрацоўваць тысячы тон атрутных газаў. Пакуль што гэтыя заводы старанна замаскаваны і займаюцца на від зусім нявінных справай.

Вось адна група мондаўскіх заводаў, якая скромненька завецца «ангельскім акцыянэрным таварыствам вырабы фарбы». Між тым ангельскі ўрад уклаў у гэтыя заводы 34 мільёны рублёў. Прадстаўнік гэтых заводаў уваходзіць у урадавы «камітэт хэмічнай абароны».

У чым-жа справа?

А справа ў тым, што ўсе гэтыя «заводы фарбы» у любы момант могуць перайсьці на выраб атрутных газаў.

Монду належаць таксама заводы па вырабе штучнай скуры і лякавыя заводы. І тут — спрытная маскіроўка. У працягу аднаго дня ўсе гэтыя «скуравыя і лякавыя заводы» могуць распачаць вытворчасьць самае жахлівае выбухаючае матэрыі — нітраглірэрыну

Ангельшчына шырока вядома масавай выпрацоўкай штучнага шоўку. Досыць лёгкае зьмены ў гэтай вытворчасьці, каб ператварыць штучны шоўк у сьмяртэльны сродак забойства—у так званы «гремучий студень».

* * *

Монд пры дапамозе меншавікоў імкнецца ўстанавіць «мір у прамысловасьці», трымаць у падпарадкаваньні рабочых, каб спакойна займацца вырабам сродкаў зьнішчэньня для вайны.

Л. К.

У ЧАДЗЕ УЗБРАЕНЬНЯЎ

Ніколі ашчэ за ўсю сваю гісторыю капі

Агляд і чыстка апарату

ШТО ЗНАЙШЛА БРЫГАДА У НАРКАМЮСЬЦЕ

ЦЯГАНІНА—ЯШЧЭ ЧАСТЫ ГОСЬЦЬ

ТЭМП ПРАЦЫ НКЮ АДСТАЕ АД ЗАПАТРАБАВАНЬНЯЎ НАСЕЛЬНІЦТВА

Самакрытыка ў пляне

Падрыхтоўчай працы да чысткі апарату, у частцы праверкі выканаўня дырэктыў партыі і кіруючых савецкіх устаноў, а таксама праверкі сваіх парламентарскіх пастаноў, не вялося. А што такая праверка патрэбна па грамадзкай лініі, можна бачыць па той праверцы, якая вядзецца па адміністрацыйнай лініі.

Самым яркім прыкладам зьяўляецца плян працы НКЮ. Асноўнае, чым ён (плян працы) характарызуецца — гэта адсутнасьць нагляду за яго выкананьнем, невызначэньне выканаўцаў паасобных пунктаў і тэрміну іх выкананьня і неадпаўкавае разуменьне некаторых пунктаў. Астатняе паяло да таго, што адзін з таварышоў заяўіў, што пункт ён выконваецца ў той час, як другі таварыш (адзін з кіраўнікоў) заяўляе, што гэты пункт выконваецца. А трэба сказаць, што дастаткова было-б выканаць толькі адзін 8 п., у якім сказана: склікаць штомесячныя нарады працаўнікоў цэнтральнай пракуратуры з мэтай праверкі працы па выкананьні пляну і самакрытыкі, а таксама для азнамленьня з асабовым складам нізавой пракуратуры і для ўзгадненьня ўсіх галін працы цэнтральнай пракуратуры», каб плян быў выкананы ў той частцы, у якой ён паогул можа быць выкананы пры даным становішчы. І трэба яшчэ сказаць, што п. 8 таксама патрэбен для «выкананьня самакрытыкі», як і для выкананьня ўсяго пляну.

„Самакрытыка" на справе

Узяць хоць-бы заметку в насьценгазеты, у якой сказана, што рэгістратура працуе «з 9 гадзіны раніцы да 5 гадзін і з 6 веч. да 12 ночы». Падобна, што тут ёсьць парушэньне Код. Зак. аб працы, аднак, бяз п. 8 і гэтае зьявішча ня будзе зьніщчана, ня гледзячы на тое, што яно мае месца ў памяшканьні пракуратуры, дзе між іншым знаходзіцца і пракурор па працоўных справах. Трэба сказаць, што поўнасьцю плян выкананы быць ня можа. Выканаць усе 35 пунктаў, з якіх 12 начынаюцца словам «вылучыць», пры тэй працы, якую нясе кожны працаўнік (у плян працы ня ўключаецца штодзённая праца ўстановы), немагчыма. Тут патрэбны працаўнікі, якія маглі-б займацца толькі вывучэньнем пытаньняў і праблем унесеных у плян, а тэгага пакуль што і няма. Пры такім становішчы трэба выбраць толькі тыя пытаньні, якія могуць быць выкананы прысутнымі працаўнікамі і без якіх у сучасны момант абыйсьціся нельга.

Дзіўна адно, што НКЮ толькі два разы ў тыдзень можа адпраўляць пошту, у той час, як зусім ясна, што эканомія на тым, што ў адно месца пойдзе некалькі паперак, будзе раўняцца толькі капейкам, а страты ад таго, што няправільна зьняты працаўнік будзе зноў прыняты на службу некалькі дзён пазьней — рублям.

Цяганіна і адносіны да яе

Адным з важнейшых недахопаў брыгада лічыць тое, што пракуратура не вярбіла захадаў для зьніщчэньня цяганіны, якая нагледзецца ў цэнтральнай пракуратуры і на месцах. Тут ужо не скажаш, што ў цяганіне вінаваты «ня мы», а пехта, хоць ёсьць такія таварышы, якія спасылаюцца на цяганіну райвыканкомаў, сельсаветаў і г. д.

Аднак, прыходзіцца адзначыць, што найбольш характэрным зьяўляецца ня столькі цяганіна (хоць і гэта мае месца) у цэнтральнай пракуратуры, колькі адносіны да яе.

Возьмем некалькі прыкладаў. У пракурора па працоўных справах прахадзіла справа Лазаковіча, № 5419—28 г. і № 1200—29 г. Ужо адны нумары гаворацьь аб тым, што справа доўга гасьціла якія яна прайшла.

1) 25-IX — 28 г. да пракурора паступіла скарга ад гр-на Лазаковіча.
2) 29-IX—28 г. скарга накіроўваецца Бабруйскаму акрпракурору.
3) 24-X—28г. насылаецца напамінак.
4) 28-XII—28г. атрымана заключэньне Бабруйскага акрпракурора (відаць «памог» напамінак).
5) 2-I—29 г. запатрабавана справа.
6) 16-I—29 г. справа атрымана.
7) 5-III—29 г. атрымана ад Лазаковіча другая заява (ня выцярпеў) і ўрэшце
8) 26-III—29 г. Лазаковічу далі адказ.

Толькі трох дзён не хапае да паўгода.

Другі выпадак. Да пракурора па агульным нагледзе 4-XII—28 г. паступіла ад вайсковага пракурора № каўкорпусу адносіна, што ён не атрымаў ад некаторых акруговых, вучастковых пракураў і іншых савецкіх устаноў адказаў на заявы чырвонаармейцаў.

10-XII—пракурор па агульным нагледзе запатрабаваў ад паказаных у адносіне вайсковага пракурора, акруговых і вучастковых пракураў тлумачэньня аб прычынах цяганіны. Напісаў і запакоіўся. Але не спакойны вайсковы пракурор — чырвонаармейцы адказаў усё-ж такі не атрымалі. Тады ён 4-IV зноў пытаецца, чаму чырвонаармейцы ня маюць адказаў.

Тут трэба было-б чакаць, што будзе нагаяй вінаватым у цяганіне па справах чырвонаармейцаў, а ў сапраўднасьці паступіў толькі катэгарычны напамінак. Але пакольні яшчэ справа ня скончана, то можна думаць, што будзе «вышэй катэгарычны напамінак», але цікава, што будзе рабіць пракурор, калі ў граматыцы ня хопіць ступеняй параўнаньня.

Няўвязка, якая патрабуе рэарганізацыі

Нешта другое мы маем у пракурора Верхсуду. Тут ужо прыходзіцца пакінуць у баку цяганіну, паколькі прыходзіцца гаварыць аб якасьці працы. Гэтыя пракуроры (іх два — адзін па грамадзянскіх, другі па крымінальных справах) павінны даваць заключэньне па ўсіх тых справах, якія праходзяць у Верхсудзе. Паглядзім, ці могуць яны гэта выканаць. За час, з 1-I—29 г. па 1-VI да пракурора Верхсуду паступіла 1.381 справа, з якіх апрацэставана 706. З ліку апрацэставаных толькі частка пайшла ў Верхсуд. З гэтага відаць, што праз пракуратуру праходзіць больш спраў, чым праз Верхсуд, пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў Верхсудзе працуе сем таварышоў, а ў пракуратуры Верхсуду толькі двое. Раўняць працу гэтых устаноў ня прыходзіцца, аднак сьмела можна сказаць, што пракуратура Верхсуду праз меру перагружана, таму і бывае, што пракурор дае заключэньне ў Верхсудзе без папярэдняга азнаямленьня з некаторымі справамі. Тут зьяўляецца незразумелым, чаму Калегія НКЮ ня хоча ўваконіць тое, што фактычна мае месца і зьяўляецца жыцьцёвым, гэта значыць, чаму не аслабаніць пракурора Верхсуду ад абавязковай дачы заключэньняў па ўсіх справах і толькі аставіць на абавязку заключэньне па найбольш важных справах? І тут прыходзіцца прыпомніць 8 п. пляну ў частцы, дзе гаворыцца: «для ўзгадненьня ўсіх галін працы цэнтральнай пракуратуры» і г. д.

Для наведвальнікаў—калідор

Для прыёму наведвальнікаў вызначаны тэрміны, але нельга сказаць, каб гэтых тэрмінаў пракуроры прытрымліваліся. Бываюць выпадкі, калі наведвальнікаў поўны калідор, а таго, хто навінен прымаць,—няма, альбо ён заняты другімі справамі. Былі і такія выпадкі, калі пракурор зусім не зьяўляўся на прыём і наведвальнікам прыходзілася ісьці дамоў в тым, в чым яны прыйшлі.

Некалькі лепшае становішча ў сьледчага па важнейшых справах. Праўда, тут таксама цяганіны нямала, але яна была выклікана тым, што да гэтага часу працаваў толькі адзін таварыш, які ня меў магчымасьці скончыць у тэрмін усе пастуючыя да яго справы, цяпер-жа в прызначэньнем яшчэ 2-х таварышоў, гэтае зьявішча будзе зьніштчана. А тое, што было, заслугоўвае, каб яно было адзначана. Напрыклад, справа Беларускай акругі сувязі распачата ў 1927г. і да гэтага часу ня толькі ня скончана сьледзтва, а нават не пачата, альбо возьмем справу Белсельсаюзу — гэта справа распачата тады, як і першая, але па гэтай справе прыцягваюцца да адказнасьці буйны гандляр і былы фабрыкант, якім, як відаць з заключэньня сьледчага, ня месца ў савецкім апараце. Аднак, дзякуючы цяганіне яны да гэтага часу служаць у дзяржаўных установах і пэўна вельмі здаволены нашай юстыцыяй. КУБАН.

ДА ВЕДАМА КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ

Яшчэ 17-га лістапада 1928 г. кіраўніцтва ільна-прадзільных фабрык «Дзьвіна» і «К. Маркса» накіравала выканаўчы ліст судоваму выканаўцу 1-га вучастку г. Менску з просьбаю спагнаць з гр. Баброва Я. А. 1.038 руб. 21 кап. Судовы выканаўца ня толькі не высылаў грошай, але нават не адказаў. Пачакаўшы некалькі месяцаў, 19-II 29 году адміністрацыя фабрыкі вьвярнулася да менскага акруговага пракурора і прасіла падвярушыць гэтую справу. Акруговы пракурор мала адстаў ад судовага выканаўцы ў гэтай справе і маўчаў таксама ўпарта 1 доўга. Тады адміністрацыя зьвярнулася за дапамогай да свайго трэсту, які ў сваю чаргу зьвярнуўся да старшыні Менскага акруговага суду 6-VI г.г. і прасіў спыніць гэтую агідную цяганіну. Але і старшыня суду, як відаць «аднаго поля ягада»—маўчаў і ён. Куды далей ісьці, куды скардзіцца? Тры просьбы ўперліся ў глухую сьцену бюракратычнага маўчаньня судовага выканаўцы і вуч., Менскага акруговага пракурора і старшыні Менскага акруговага суду—тых людзей, якія пастаўлены сачыць за законам і парадкам.

Урэшце Белдзяржтэкстыльгандаль 17 ліпеня піша ў НК РСІ і пракурору Рэспублікі, просячы іх «высьвятліць прычыны такога роду ніяк незразумелай для нас цяганіны». Будзем спадзявацца, што пракурор Рэспублікі разьбярэцца ў гэтай справе і сурова пакарае вінаватых, ня гледзячы на асобы і іх службовае становішча.

НІЛІН.

Беларуская вёска без аграномаў

У МАЗЫРШЧЫНЕ—САДАВОДЫ ЗАМЕСТ АГРАНОМАЎ.—ТАМ, ДЗЕ КОНЬ ДАРАЖЭЙ АГРАНОМА.—АГІДНЫЯ АДНОСІНЫ РВК ДА АГРАПЭРСАНАЛУ.—АГРАПУНКТЫ Ў КАНЮШНЕ.—СПЭЦЫЯЛІСТЫ Ў РОЛІ РАССЫЛЬНАГА

Кіруючыя органы павінны тэрмінова вырашыць пытаньне аграабслугоўваньня вёскі

У свой час «Зьвязда» адзначала неабходнасьць удзяліць максымум увагі пытаньню падрыхтоўкі кадраў пры складаньні пяцігодкі БССР. Асабліва востра, як вядома, у нас стаіць справа в падрыхтоўкай спэцыялістых па розных галінах сельскае гаспадаркі. Зусім зразумела, што выканаць наш пяцігадовы плян па сельскай гаспадарцы немагчыма без наяўнасьці адпаведнай колькасьці спэцыялістых.

Ужо зараз па БССР адчуваецца вялікі недахоп у с.-г. спэцыялістых. У некаторых мясцох абслугоўваньне вёскі спэцыялістыі прыняло такі характар, што прыходзіцца ўжо крычаць аб неабходнасьці хуткай дапамогі.

Характэрнай у гэтых адносінах зьяўляецца Мазырская акруга. З 10 райаграномаў Мазыршчыны 5 пачалі працаваць толькі сёлета; трое маюць двухгадовы стаж, а двое—трохгадовы.

У лельчыцкім раёне зусім няма райагранома.

Замест 45 намесьнікаў райаграномаў ёсьць толькі 35. 18 асоб з апошніх папалі ў Мазыршчыну са школьнай скам'і і пачынаюць толькі сёлета сваю практычную работу. Акрамя таго, пяць з іх — садаводы, якія нічога агульнага ня маюць з паляводзтвам. Пяць другіх ня маюць нават сярэдняй аграасьветы—яны скончылі украінскую прафшколу.

Зусім зразумела, што в гэткім складам аграманімічнага пэрсаналу далёка не паедзеш. Па-першае шмат месц дагэтуль яшчэ застаюцца вакантнымі, па-другое, рад пасад заняты людзьмі, якія ня маюць адпаведнай адукацыі.

Дзе прычыны такога зьявішча?

Галоўныя з іх: адсутнасьць сродкаў на разьезды для аграномаў. Забалочаныя абшары, вялікія падраёны, раскіданасьць насельніцкіх пунктаў, недапушчальныя адносіны мясцовай адміністрацыі да агранамічнага пэрсаналу, слабая матар'яльная забясьпечанасьць аграномаў.

Спынімся крыху падрабязна на гэтых прычынах. Для раёнага агранамічнага вучастку на разьезды райаграномаў адпускаецца 150-180 руб. у год, а для іх намесьнікаў—120 р. Кожны разумее, што гэтых грошай хопіць толькі на месяц-два ня больш. Выхадам з становішча магла-б зьявіцца закупка коняй для абслугоўваньня аграномаў, але аб гэтым пакуль што ня думаюць.

Ва ўсёй Мазыршчыне замест 10 аграпунктаў існуе толькі 4, в якіх між іншым 2 фактычна ліквідаваны. На гэтым факце варта спыніцца. У Пятрыкаўскім раёне райвыканком адабраў памяшканьне аграпункту ў 1928 годзе, каб у ім абстальваць сямігодку. Аграпункт быў выселены ў тэрміновым парадку ў адну з крам на рынку. Аграномам прышлося ўсе свае інструменты і плякаты склаць у скрыню... Так гэтыя скрыні і да гэтага часу не распакаваны. Праўда, для аграпункта адвялі другое памяшканьне, але такое, якое мала чым адрозьніваецца ад ранейшага.

Аналёгічная гісторыя мела месца летась і ў Нараўлянскім раёне. Там РВК высяліў аграпункт у прыватную кватэру.

Аб адносінах райвыканкомаў да спэцыялістых сьведчаць наступныя факты. У Каралінскім раёне РВК зьмясьціў райагранома на пасаду намесьніка райагранома, не ўзгадніўшы гэтага пытаньні з прафсаюзам, ні з Акрэа. Ці адпавядаў гэты працаўнік свайму прызначэньню? Каб адказаць на гэта, даволі адзначыць, што ён працаваў у якасьці райагранома ў другім раёне 6 год.

Райаграном з пастановай РВК не згадзіўся і перайшоў на працу ў калгасаюз. Каралінскі РВК замяніў яго... садаводам.

Прыблізна такі-ж факт меў месца і ў Калінкавіцкім раёне. Першае «наступленьне» РВК на райагранома прафсаюзу ўдалося адбіць. Калі РВК у другі раз спрабаваў «наступаць», дык райаграном плюнуў і паехаў на Паўночны Каўказ.

Так, між іншым робяць усе тыя спэцыялістыя, якія не жадаюць працаваць у такіх ўмовах. Звычайна яны ўсе знаходзяць сабе прытулак альбо на Украіне, альбо на Паўночным Каўказе. Туды вандруюць найлепшыя нашы вясковыя агранамічныя сілы.

Прафсаюз імкнецца не вынускаць такіх аграномаў з БССР, затрымаць іх, пасылаючы на працу ў Калгассаюз.

Недапушчальныя адносіны маюць месца ня толькі да аграномаў, але і да іншых спэцыялістых на вёсцы. Нараўлянскі раён, напрыклад, пакінуў сёлета і зоотэхнік.

Калі прыняць усё гэта пад увагу, дык ня дзіва, што сярод усіх аграномаў, якія працуюць на Мазыршчыне, толькі адзін з выпэйшай асьветай, і такое становішча мы наглядаем у БССР, дзе ёсьць уласная сельска-гаспадарчая Акадэмія, якая штогод выпушчае нямала аграномаў.

Між іншым ня лепш справа і з акруговымі спэцыялістымі ў Мазыры. З сакавіка месяца ў Мазыры няма акруговага агранома. Пасеўная кампаніяй кіраваў акруговы... зоотэхнік. Між іншым у працягу гэтага году ў Мазыры перамянілася 2 акруговых садаводы. Запрасілі трэцяга садавода, але бяз вышэйшай асьветы і чалавека, які ня мае практыкі. Пакінуў Мазыр і акруговы торфмайстар. Намесьніка яму яшчэ не знайшлі. Зараз уходзяць зоотэхнік і палявод з раённых культуртэхнікаў.

Падзянья факты сьведчаць аб поўным развале ў справе абслугоўваньня вёскі спэцыялістымі. Адчуваецца гэта і па другіх акругах, аб гэтым трэба крычаць, але ў Мазыршчыне ўсе гэтыя ненармальнасьці набылі характар заціжнай і цяжкай хваробы.

Зразумела, што прайсьці міма гэткіх зьявішчаў нельга. Хтосьці павінен адказаць за гэта. І сапраўды, што, напрыклад рабіў Мазырскі Акрэа, каб зьліквідаваць усе гэтыя ненармальнасьці? Дзе быў акрвыканком, які абавязаны кіраваць справай рэканструкцыі с.-г. у акрузе?

У цяні ня можа застацца і Наркамзем БССР; здаецца, што справа датычыць і яго.

Трэба канстатаваць, што да гэтага часу ні ў Менску, ні ў Мазыры ня ўліваліся спэцыфічныя ўмовы працы для спэцыялістых у Мазырскай акрузе. У выніку усяго гэтага пастанова ўраду аб узмацненьні аграданамогі на Мазыршчыне засталася на паперы; мерапрыемствы па падвышэньні ўраджайнасьці сарваны.

Агіднасьці, якія маюць месца ў Мазыршчыне, наглядаюцца і ў іншых акругах. Прыкладам гэтага можа служыць Веткаўскі раён, Гомельская акруга, дзе аграпункт, згодна пастановы РВК быў пераведзены ў стайню. У гэтым раёне спэцыялісты па барацьбе з шкодзікамі скарыстоўваюцца для падшуканьня падвод артыстым.

Пры такім ня стачы спэцыялістых і такім іх скарыстаньні ня можа быць і гутаркі аб хуткай рэканструкцыі с.-г. БССР. Нельга ні праводзіць пасеўныя кампаніі не падвышаць ураджайнасьці, ні каапэраваць—нічога нельга рабіць такога, што дапамагло-б адпавіць нашу сельскую гаспадарку.

Што-ж можна і трэба зрабіць?

Па-першае, трэба, каб Беларуская Сельска-Гаспадарчая Акадэмія рыхтавала аграномаў для Беларусі, а не для іншых раёнаў СССР, што не ўваходзіць у яе задачы. Канкрэтна гаворачы, трэба аграномаў, якія канчаюць нашу Акадэмію, абавязаць пэўны пэрыяд часу працаваць у Беларусі, бо большасьць выхавальнікаў Акадэміі едзе на Украіну і Паўночны Каўказ.

Падругое, трэба ў корані зьмяніць адносіны РВК да аграпэрсаналу. Аграномы не павінны займацца канцылярышчынай, а працаваць па прызначэньні. Ніякі аграном ня дасьць таго, што ён можа даць, калі яму ня будуць прадастаўлены сродкі для разьездаў. Зразумела, што за такія штукі, як перавод аграпункта ў стайню, трэба даць па руках. Трэба зрабіць немагчымым паўтарэньне аналёгічных выпадкаў.

Зусім асобна трэба гаварыць аб Мазырскай акрузе. Становішча ў гэтай акрузе трэба дакладна вывучыць. Але ўжо зараз неабходна канстатаваць, што аграпэрснал павінен быць пастаўлены ў лепшыя ўмовы. Гэта значыць, што ў Мазыршчыне аграном павінен лепш забясьпечвацца матар'яльна, абавязкова атрымліваць сродкі для разьездаў і г. д. Трэба таксама стварыць там жывое кіраўніцтва аграпрацай на месцах.

Пытаньне аб аграабслугоўваньні беларускай вёскі стаіць вельмі сур'ёзна і адкладаць яго ніяк нельга. Адпаведныя кіруючыя органы павінны тэрмінова заняцца яго вырашэньнем, памятаючы, што выканаць пяцігодку без выстарчальнай колькасьці спэцыялістых не магчыма.

В.

Падрыхтоўка да Міжнароднага Чырвонага Дня

РАШУЧЫМ РАЗГОРТВАНЬНЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА УЗМАЦНІМ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ СССР

Пад гэтым лёзунгам рыхтуюцца беларускія прафсаюзы да Міжнароднага Чырвонага Дня

Падрабязовая праверка ходу падрыхтоўкі да Міжнароднага Чырвонага Дня, якую правёў культадзел ЦСПСБ, паказала, што Цэнтральныя праўленьні саюзаў за апошнія дні разгарнулі актыўную дзейнасьць.

Большасьць праўленьняў саюзаў распрацавала падрабязныя пляны правядзеньня Міжнароднага Дня і абмеркавала іх на пырокіх нарадах фабзаўмясцкомаў і прафактыву. Напрыклад, у плян харчавікоў уваходзяць агульныя сходы на прадпрыемствах, гутаркі ў часе абедзенага перапынку, масавы вечар у клюбе, укамплектаваньне бібліятэк літаратурай і г. д. У пляне саюзу Мэдсанпрацы, які быў абмеркаваны на нарадзе райгрупкомаў і гарадзкіх мясцкомаў, прадугледжаны сходы па лекавых установах, вечэзаваны паход у Ждановічы. У пляне саюзу гарбароў—гутаркі па прадпрыемствах, спэцыяльная друкаваная і насьценная газэты, вечэзаваны паход; па саюзе працасьветы—выезд у лягеры, агульна-саюзны вечар сумесна з падшэфнай вайсковай часткай і г. д.

Ужо зараз на прадпрыемствах праводзяцца агульныя і зьменныя сходы, гутаркі ў часе абедзенага перапынку ў цэхах і чырвоных кутках. Усе гэтыя даклады і гутаркі, згодна дырэктывы ЦСПСБ, праводзяцца пад лёзунгам **узмацненьня тэмпу індустрыялізацыі, рашучага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, барацьбы з усімі недахопамі на прадпрыемствах, актыўнай дапамогі партыі і савецкай уладзе ва ўсіх пачынаньнях**, што, у канчатковым выніку прывядзе **да росту дабрабыту краіны і ўзмацненьня яе абароназдольнасьці.**

І жніўня ў клюбах адбудуцца масавыя вечары, мастацкіх пастаноў. У часе дэманстрацыі адбудзецца вялізны карнавал. Некаторыя прафсаюзы рыхтуюцца да выезду ў вёскі для растлумачэньня сялянству значэньня Міжнароднага Дня. Гэта ўсё робіцца ў большасьці саюзаў.

Але, ёсьць і такія прафсаюзы, дзе падрыхтоўцы да Міжнароднага Дня ўдзелена вельмі мала ўвагі. Напрыклад, **саюз сельгаслесрабочых**, які, здаецца, павінен быў разгарнуць вялікую працу па ўцягненьні батрацтва для ўдзелу ў Міжнародным Дні, **яшчэ нічога не зрабіў.** ЦК саюзу **працаўнікоў мастацтва** толькі 20-га ліпеня павінен быў абгаварыць гэта пытаньне на нарадзе мясцкомаў. **Такія адносіны да падрыхтоўкі** да Міжнароднага Дня **павінны быць асуджаны самым рашучым чынам.**

Але, асобныя такія моманты, як невыстарчальны ўдзел некаторых арганізацый у падрыхтоўцы да Міжнароднага Дня, **усё-ж не сарве грандыёзнага выступленьня пралетарыяту супроць вайсковай небясьпекі.** Пралетарыят Беларусі рыхтуецца прыкладна правесьці Міжнародны Чырвоны Дзень і з баявымі лёзунгамі камуністычнай партыі і прафсаюзаў продэманструе сваю салідарнасьць з міжнародным пралетарыятам і сваю пастаянную гатоўнасьць да барацьбы за ўзмацненьне СССР, за міжнародную рэвалюцыю, за будаўніцтва сацыялізму.

П.

ЯК ІДЗЕ ПАДРЫХТОЎКА У МЕНСКУ

Усе партыйныя, прафэсіянальныя і грамадзкія арганізацыі гор. Менску разгарнулі вялікую падрыхтоўчую працу да Міжнароднага Чырвонага дню.

Па саюзах

Па ўсіх саюзах гораду адбываюцца масавыя вечары-мітынгі ў летніх садох з дакладамі на тэму аб МЧД і аб інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных.

20 ліпеня ў летнім садзе будаўнікоў на масавым вечары прысутнічала каля 2.000 чалавек. Будаўнікі з вялікай зацікаўленасьцю аднесьліся да дакладу. Яны з абурэньнем сустрэлі наведамленьне аб бандыцкім налёце на Ўсходня-Кітайск. чыгунку і недазволе фашысцкай Пэльшчы савецкай дэлегацыі прыехаць на варшаўскі зьезд. У рэзалюцыі будаўнікі заяўляюць, што ўсе, як адзін, пойдуць на абарону савецкай краіны ў выпадку нападу імпэрыялістых. Такія-ж масавыя мітынгі адбудуцца 23 і 24 па саюзах друкароў і саўгандальслужачых.

Сярод жанчын

Жанаддзел сумесна з АК МОПР'у арганізуе 24 ліпеня ў клюбе К. Маркса масавую агульна-гарадзкую інтэрнацыянальную канфэрэнцыю працоўных жанчын, прысьвечаную Міжнароднаму Чырвонаму Дню. З вялікім дакладам выступіць т. Славінскі.

Культ-нарады

25-е ліпеня культадзел ЦСПСБ сумесна з АК МОПР'у склікае ў клюбе К. Маркса пашыраную культнараду з удзелам прадстаўнікоў ад фабзаўмясцкомаў, камсамолу, жанаддзелу, а таксама ўсіх таварышоў, якія вылучаны ад камсамолу, жанаддзелу і ячэек МОПР'у для ўдзелу ў мопраўскім карнавале. На нарадзе будзе абгаворвацца плян і зьмест карнавалу і парадак скарыстаньня ўсіх удзельнікаў.

Па камсамолу

Менскі АК ЛКСМБ і МОПР'у зьвярнуліся з адозвай да камсамольцаў і моладзі Менскай акругі, у якой рабочасялянская моладзь заклікаецца да пратэсту супроць ваеннай небясьпекі, супроць здрадніцкай палітыкі сацыяльфашыстых, да інтэрнацыянальнай выхаваўчай работы і да падрыхтоўцы да МЧД. Экзэмпляры адозвы будуць распаўсюджаны па ячэйках і будуць раздавацца на інтэрнацыянальным агульна-гарадзкім масавым мітынгу ў летнім садзе «Прафінтэрн» 27 ліпеня. На гэтай масоўцы з вялікім дакладам выступіць аб МЧД т. Рыжоў.

У Асоавіяхіме і Чырвоным Крыжы

Разгорнута праца на ячэйках Асоавіяхіму і Чырвонага Крыжу аб удзеле ў дэманстрацыі 28 ліпеня. Усе гурткі вайсковых ведаў, самакатчыкі, хэмічныя каманды, санітарныя гурткі Чырвонага Крыжу мабілізуюцца Асоавіяхімам для дэманстрацыі 28 ліпеня. Да гэтай дэманстрацыі далучаюцца ўсе фізкультурнікі г. Менску, а таксама мопраўскі карнавал.

У Чырвонай армії

Вядзецца таксама вялікая растлумачальная праца аб МЧД сярод чырвонаармейскіх часьцей у лягерох. Праводзяцца гутаркі, сэмінары і сходы з чырвонаармейцамі.

У АК МОПР'у

У самым разгары зараз—падрыхтоўка да МЧД на ячэйках МОПР'у. Па ўсіх раёнах склікаюцца папыраныя пленумы, на якія выяжджаюць прадстаўнікі АК МОПР'у. Усе гарадзкія ячэйкі МОПР'у наладжваюць выезды ў падшэфныя вёскі на дапамогу вясковым ячэйкам у падрыхтоўцы да МЧД. Кіпіць праца па падрыхтоўцы да карнавалу. Прыцягнуты лепшыя скульптары, мастакі, дэкаратары, якія узялі на сябе мастацкае афармленьне карнавалу. У карнавале прымаюць удзел усе артыстыя музычнай камэдыі. Жаночы актыў, краўцы (шапачнікі—мопраўцы) загатаўляюць гарнітуры, шапкі, маскі для карнавалу. У карнавале будзе ўдзельнічаць каля 500 чал. мопраўцаў. Шэствіе пачнецца а 12 гадзіне раніцы 28 ліпеня па вуліцах—К. Маркса, Чырвонаармейскай, наўкола сквэру, Савецкай да рогу Энгельса, па вул. Энгельса і па Паяц Волі.

Увесь карнавал будзе засьняты Белдзяржкіно для кіно-фільму.

Па акругах

Гомельскі, Віцебскі і Магілеўскі акругкомы МОПР'у таксама рыхтуюць карнавалы да МЧД, удзельнічаць у якіх прыцягваецца шырокая грамадзкасьць.

Цудзін.

ЧАКАЮЦЬ ДЫРЭКТЫУ

Праверка падрыхтоўкі да Чырвонага Дня па некаторых віцебскіх прафсаюзах паказала, што ня ўсе саюзы рыхтуюцца аднолькава. У вучпрафсожы адказалі коратка:

— Разгортваем.

У саюзе швэйнікаў сустрэлі са зьдзіўленьнем:

— Міжнародны Чырвоны Дзень? Ня чулі пра такі... Дырэктыў ніякіх няма.

У саюзе сельгаслесрабочых чакаюць паседжаньня прэзыдыуму, каб паставіць гэта пытаньне.

Параўнаўча добра ідзе падрыхтоўка па саюзах будаўнікоў і гарбароў. Праводзяцца сходы рабочых, на прадпрыемствах скарыстоўваецца абедзены перапынак для гутарак аб значэньні Чырвонага Дня, скарыстоўваюцца чырвоныя куткі.

Да Чырвонага Дня засталося мала часу. Трэба, каб усе саюзы скарысталі апошнія дні для больш шырокай папулярызацыі мэт і значэньня Міжнароднага Чырвонага Дня.

Д.

Як будзе праведзены Міжнародны Дзень у Гомелі

На нарадзе АПА пры акругкоме КП(б)Б было абмеркавана пытаньне аб правядзеньні Міжнароднага Чырвонага Дня. Нарада рашыла зараз-жа пачаць масавую агітацыйна - прапагандысцкую работу па ўсёй акрузе, арганізаваць выезды на вёску, правесьці гутаркі сярод рабочых, з 21 па 22 ліпеня арганізаваць экскурсіі, клюбныя вечары і гульні.

Нарада намеціла наступны плян правядзеньня і жніўня ў горадзе: масавая дэманстрацыя з удзелам Чырвонай армії, вытворчых і піянэрскіх арганізацый. У дэманстрацыі таксама прымуць удзел члены сем'яў рабочых.

Двухтыднёвік фізкультуры таксама будзе скарыстаны для шырокай масавай прапаганды аб значэньні Чырвонага дня. Раённыя камісіі, шэфтаварыствы, арганізацыі МОПР'у і Асоавіяхіму рыхтуюць дакладчыкаў для выезду ў вёскі. Будуць скарыстаны для дакладаў і таварышы з правертроек.

Падрыхтоўка ў Полацку

З 20-га ліпеня па ўсіх гарадзкіх клюбах і чырвоных кутках праводзяцца гутаркі, гучныя чыткі газэт аб вайсковай небясьпецы, аб задачах па выкананьні пяцігадовага пляну і інш.

Бібліятэкі падрыхтоўваюць палітычную і мастацкую літаратуру да Чырвонага Дня. На прадпрыемствах наладжваюцца гутаркі з рабочымі аб значэньні Чырвонага Дня і задачах інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Да 28 і 29 ліпеня шэфкамісіі рыхтуюць выезды на вёскі. 31 ліпеня ўвечары па ўсіх прадпрыемствах будуць праведзены агульныя сходы рабочых і служачых і прачытаны даклады аб значэньні Дня 1 жніўня.

1 жніўня а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца агульна-гарадзкая дэманстрацыя і рад лятучых мітынгаў.

Сотні тысяч рублёў

укладваюць працоўныя БССР у індустрыялізацыю краіны

Творчы ўздым мас служыць лепшым адказам на правакацыю імпэрыялістых

Спаборніцтвы на лепшую падпіску

Завод „Дрэваапрацоўшчык" выклікаў Бабруйскіх рабочых

За два дні падпіска на 3-ю пазыку на ЗАВОДЗЕ «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК» дала 10 тысяч рублёў. Самы меншы разьмер падпіскі—100 проц. месячнай зарплаты. Многія падпісаліся на 150 проц. і на 200 проц. Вучань МАГЕР, які атрымлівае 21 р. зарплаты, падпісаўся на 75 руб., РАБОЧЫ КІСЕЛЬ, які атрымлівае 90 руб., падпісаўся на 320 р. Рабочыя заводу выклікалі на спаборніцтвы па падпісцы рабочых-экскурсантаў Бабруйскай лесапільні № 6, якія прыехалі ў Менск, каб пазнаёміцца з ходам сацыялістычнага спаборніцтва на заводзе «Дрэваапрацоўшчык». Экскурсанты прынялі выклік і падпісаліся на 2.000 руб. Рабочы ДАВІДКОВІЧ, які атрымлівае 50 р., падпісаўся на 200 руб.

За 4 гадзіны—сем тысяч рублёў

Падпіска ў артылерыстых

Тысячная маса. Байцы артылерыстыя цесным кальцом акружылі лягерную сцэну.

— Мы заяўлем: байцы Чырвонай армії ў поўнай балявой гатоўнасьці

— Наш порах сухі, нашы гарматы, гаўбіцы прачышчаны і замазаны... Наводчыкі па месцах... Гарматы гатовы, як паніча партыя, адкрыць агонь.

— Мы патрабуем выпуску 3-й пазыкі.

Вось адказ байцоў нашага артыл. лягернага збору на напад кітайскіх імпэрыялістых.

Зараз-жа адкрываецца падпіска, яна праходзіць пад лёзунгам *„Наш адказ кітайскай белагвардзейшчыне"*.

За першыя чатыры гадзіны полк даў сем тысяч рублёў.

Мы выклікалі ўзяць в нас прыклад усю артылерыю № корпусу і палкі Беларускай дывізіі.

Златкін.

64 тысячы руб.—за адзін дзень

Падпіска на пазыку ў Наркамземе ідзе добра.

Супрацоўнікі апарату, спэцыялістыя з вялікім спачуваньнем аднесьліся да прапановы аднаго з служачых—падпісацца на 3-ю пазыку.

За адзін дзень падпіска ў Наркамземе дала звыш 64 тысяч руб.

* * *

Па ініцыятыве спэцыялістага Савіча пачалася падпіска ў Белшвэйтрэсьце. Падпісаліся ўжо на 3.000 р.

Першым — дарожны аддзел

Полацак (*Наш кар.*). *Амаль па ўсіх прадпрыемствах і ўстановах гораду па ініцыятыве рабочых і служачых вынесьлася прапанова аб выпуску 3-ай пазыкі індустрыялізацыі.*

Пачалася папярэдняя падпіска сярод рабочых і служачых. У горадзе арганізавана камісія па садзейнічаньні рэалізацыі новай пазыкі.

Найбольш пасьпяхова прайшла падпіска ў дарожным аддзеле.

Калектыў Дарожнага аддзелу зрабіў падпіску на 10 тыс. руб.

Падпіска ахапляе ўсё новыя калектывы

Супрацоўнікі праўленьня і Менскага аддзяленьня Беларгасаюзу ў яку 140 чал. падпісаліся на суму каля 14 тыс. руб.

Пасьпяхова праводзіцца здача аблігацый 2-й пазыкі на калектыўнае хаваньне —паступілі аблігацыі ад 40 чалавек, на 3.500 руб.

* * *

Служачыя Аршанскага акрфа падпісаліся на 150 проц. месячнага акладу і пастанавілі заплаціць першы ўзнос за аблігацыі з 1 верасьня. Падпіска па калектыву дала 8 тыс. р.

* * *

Курсанты 3-й роты АБВШ *Жукоўскі, Тукін, Вайтовіч, Лашук, Курган, Драздоўскі і Рыдлеўскі* падпісаліся в сваёй мізэрнай пэнсіі на 200 руб. і выклікалі ўсіх курсантаў і камоклад АБВШ.

* * *

Калектыў працаўнікоў Капыльскага РВК падпісаўся на 3-ю пазыку на суму 1.600 рублёў. Выкліканы ўсе калектывы служачых раёну.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Маскоўская рабочая дэлегацыя—аб яўрэйскіх калгасах

МАЗЫ

Самалёт Асоавіяхіму ў Менску

НА ЗДЫМКУ: зьверху—бортмэханік тав. Налідаў рыхтуе матор да палёту, зьнізу—агульны від самалёту

У нядзелю, а 9 гадз. раніцы ў Менск прыляцеў з Масквы агітсамалёт «Усе ў Асоавіяхім». Самалёт прыляцеў, каб забраць дэлегацыю намесніх піянэраў, якая прыяжджае на ўсесаюзны зьлёт піянэраў. У нядзелю і ўчора самалёт рабіў агітпалёты па г. Менску, падымаючы актыўных членаў Асоавіяхіму. Усяго самалёт падняў 56 чал.

Заўсёды гатовы...

Камсамолія Кастрычнікавай арганізацыі—у паходзе

Для менскай камсамоліі вайсковы паход—ня новая справа ў практыцы вайсковай падрыхтоўкі працоўнай моладзі, камсамольская арганізацыя праводзіць такія паходы даволі часта. Кожны паход узмацняе баявую падрыхтаванасьць камсамолу, абагачае новымі вайсковымі ведамі рабочую моладзь фабрык і заводаў Менску.

* * *

У суботу, а 4-й гадзіне дня да памяшканьня Кастрычнікавага райкому камсамолу пачалі падходзіць атрады камсамольцаў з розных прадпрыемстваў і ўстаноў гораду. Тысячы камсамольцаў і беспартыйных маладых рабочых выступілі ў паход...

* * *

У вёсцы Дражні разьмясьціліся «сінія». У штабе „сініх" распрацоўвался плян абароны ад «чырвоных», якія, паводле вестак, рыхтуюць наступленьне з Менску. Паліткіраўнікі ў часьцях тлумачылі маладым-рабочым задачы пралетарыяту у сучасны момант,—задачы абароны краіны ад нападаў імпэрыялістых.

* * *

А 4-й гадзіне раніцы пачалася перастрэлка паміж разьведкамі абодвых „бакоў". Гэта было першым сыгналам аб наступленьні «чырвоных». Праз некаторы час разгараўся бой. Пачуліся выбухі гармат, засакаталі кулямёты, заляскалі стрэлы вінтовак.

* * *

У лягерох «Чырвонае Урочышча» войска спынілася на абед. Чырвонаармейцы лягераў прынялі рабочую моладзь вельмі горача. Будучая зьмена Чырвонай арміі адчувала сябе ў гасьцёх у сваіх старэйшых братоў, як нельга лепш...

* * *

Лятучы мітынг... Падведзены вынікі паходу. Ці гатова працоўная моладзь Менску абараніць сваю краіну у выпадку нападу імпэрыялістых?

— Мы заўсёды гатовы,—так адказала рабочая моладзь Кастрычнікавай арганізацыі.

Экскурсія гомельскіх рабочых

У Менск з Гомелю прыехала экскурсія рабочых гомельскай абутнавай фабрыкі у складзе 20 чалавек. Экскурсанты азнаёмяцца з пастаноўкай працы на менскай абутнавай фабрыцы.

КЛЮБ імя К. МАРКСА

У чацьвер, 25-ліпеня, а 7 гадз. увеч. Культаддзел ЦСПСБ сумесна з АК МОПР'у,

СКЛІКАЕ

шырокую культ-нараду

з удзелам прадстаўніоў фабзаўкомаў, камсамолу, жанаддзелу і ўсіх таварышоў, якія вылучаны ячэйкамі МОПР'у

ДЛЯ УДЗЕЛУ У МОПРАУСКІМ КАРНАВАЛЕ

—) ПАРАДАК ДНЯ: (—
1. Аб зьмесьце і плян карнавалу
2. Аб спарыстоўваньні ўдзельніаў карнавалу

Усе ячэйкі МОПР'у гор. Менску павінны вылучыць па 5 чал. ад кожнай ячэйкі для ўдзелу ў карнавале і прысылаць іх на нараду

КУЛЬТАДДЗЕЛ ЦСПСБ.
МЕНАКРУГКОМ МОПР'у.

Закрыўся ўсебеларускі зьезд жыльлёвай каапэрацыі

21-га ліпеня закончыўся ўсебеларускі зьезд жыльлёвай каапэрацыі, на які прыехала 70 ДЭЛЕГАТАЎ з усіх округ Беларусі. Зьезд адкрыў старшыня савету жыльлёвай каапэрацыі т. БЭНЭК. Зьезд заслухаў даклад члена ўсесаюзнага савету жыльлёвай каапэрацыі т. ВАЙНШЭЙНКЕРА аб становішчы і разьвіцьці жыльлёвай каапэрацыі ў БССР.

З справаздачным дакладам аб рабоце Белжылсаюзу выступіў т. ЛЕВІН, які характарызаваў рост жыльлёвай каапэрацыі ў БССР. У Беларусі налічваецца 81 жакт і 63 жыльлёва-будаўніча-каапэрацыйныя таварыствы. Жакты арэндуюць 632.000 квадратных мэтраў жыллоплошчы, што складае 77 проц. усяго муніцыпалізаванага фонду БССР.

Паявы капітал будаўнічай каапэрацыі вырас за апошнія 2 гады з 164.000 да 590.000 р. Белжылсаюз за час свайго існаваньня пабудаваў 600 дамоў на 2.000 кватэр. З агульнай колькасьці 4 тысячы членаў жыльлёва-будаўнічай каапэрацыі здаволена кватэрамі 46,1 проц.

5-ці гадовы плян намячае буйнае разьвіцьцё жыльлёвай каапэрацыі ў БССР. Па пляну на новае будаўніцтва будзе выдана 7½ мільёнаў рублёў і на рамонт дамоў, арэндаваных жактамі, каля 7 мільёнаў.

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦКК, ЦВК і СНК БССР і Ўсесаюзнаму савету жыльлёвай каапэрацыі.

Абрана новае праўленьне Белжылсаюзу і савет жыльлёвай каапэрацыі. Старшынёй савету абраны тав. Гініявіч (Наркампрацы) і старшынёй Белжылсаюзу т. ЛЕВІН.

5-гадовы юбілей заводзкіх пажарных дружын

У нядзелю адбылося сьвяткаваньне 5-гадовага юбілею пажарных заводзкіх дружын. У дзень на пляцы Волі адбыўся парад пажарных дружын, пасьля яго ўрачыстае пасяджэньне ў кіно «Культура», на якім з прывітаньнямі выступілі ад ВСНГ т. СТРАКОЎСКІ, ад Дзяржпраху—т. ЧАРНУШЭВІЧ і прадстаўнікі іншых арганізацый. На пасяджэньні ўшанавалі старэйшых пажарнікаў. Каля 30 чалавек атрымалі розныя ўзнагароды.

Пабудова заводу па выробе чарапіцы

Дасьледчая партыя горнай групы ВСНГ выявіла паклады чарапічнай гліны ў Віцебску, у раёне цагельні. На месцы знаходжаньня паклада будзе пабудаваны чарапічны завод, які ў наступным годзе ўжо пачне выпускаць 1 мільён чарапіцы ў год.

Рабочы-друкар—акруговы інспэктар працы

ЦП саюзу друкароў вылучыла рабочага 1-ай дзярждрукарні тав. Бэрштэйна на пасаду менскага акруговага інспэктара працы.

Чырвоныя куткі не пабудованы

ЦП саюзу будаўнікоў асыгнавала 2.000 рублёў на арганізацыю чырвоных куткоў на новых пабудовах.

СУД

Хабарніцтва і растраты ў Калінкавіцкім лясьніцтве

Лесавод Супрановіч Лявон яшчэ пры царскай уладзе служыў на адказных пасадах у Калінкавіцкім лясьніцтве. Пасьля рэвалюцыі Супрановіч застаўся на месцы. Спачатку ён быў намесьнікам лясьнічага, а потым стаў лясьнічым. Як лясьнічы, Супрановіч быў матар'яльна забясьпечаны, асабліва ў апошнія гады, калі ў лясьніцтве пачаліся гаспадарчыя распрацоўкі, за якія лясьнічаму выдаваліся прэміяльныя. Але для лясьнічага гэтага было мала і ён з мэтай нажывы сыстэматычна рабіў розныя злачынствы. Супрановіч глядзеў на лясьніцтва, як на свае ўласнае прадпрыемства, дзе ён, як гаспадар, можа рабіць, што толькі яму захочацца. Трымаючы цесную сувязь з спэкулянтамі і пры іх дапамозе, Супрановіч прысвойваў дзяржаўныя грошы, высякаў лес, раскрадваў яго і рабіў розныя падлогі. Каб замясьці сьляды злачынства, лясьнічы заблытаў справаздачнасьць, акружыў сабе «адпаведным» штатам, сярод якога можна было знайсьці заможнікаў, гандляроў і былых жандараў. Калі на працу ў лясьніцтва быў накіраваны ў якасьці палітычнага кіраўніка вылучэнец, рабочы Новікаў, то Супрановіч не знайшоў для яго лепшай работы, як даручыць весьці кнігу выходзячых папер.

Супрановіч так абнаглеў, што арганізаваў патаемныя лясныя склады, адкуль лес раскрадваўся цэлымі вагонамі.

Адным з «памочнікаў» Супрановіча быў прадстаўнік адэскай арцелі «Перамога ў працы»—Шмуклер, які заключыў з лясьніцтвам умову на 50 куб. саж. дроў, але пры дапамозе лясьніцтва атрымаў больш, чым у два разы дроў, за што, зразумела, належная сума грошай трапіла ў кішэню і Супрановіча.

Па сьлядох «патрона» ішоў і загадчык складу лясьніцтва, былы жандар, Чарнуха Цімох.

Цэлы тыдзень Мазырскі акруговы суд разьбіраўся ў «сыстэме» і «камэрцыі» Супрановіча і ўстанавіў, што ад такога гаспадараньня ў Калінкавіцкім лясьніцтве дзяржава мела каля 20 тысяч руб. страт.

Суд прыгаварыў Супрановіча на 8 год зьняволеньня са строгай ізаляцыяй і з пазбаўленьнем правоў на 3 гады; Шмуклер прыгавораны на 3 гады зьняволеньня з строгай ізаляцыяй і паражэньнем у правох на 1 год; Чарнуха, па дапасаваньні да яго амністыі, прыгавораны на 1 год зьняволеньня.

Акрамя гэтага, суд пастанавіў спагнаць з асуджаных паказаную вышэй суму ў карысьць НКЗ.

Да справы яўрэйскіх шавіністых з аршанскай рымарнай майстэрні

5 дзён Аршанскі акруг. суд разглядаў справу аб зьдзеках яўрэяў шавіністых Неймана, Хэйфэца, Фаермана і Гурвіча з работніцы аршанскай рымарнай майстэрні, беларускі Шарап.

Суд прыгаварыў шавіністых павабавіць волі—Фаермана і Неймана на 1 год кожнага, Гурвіча—на 6 мес. і Хэйфэц—на 3 месяцы.

Па амністыі зьняволеньне першым двум скарочана на палову, апошнія два вызвалены

2-гі акруговы зьезд сельска-гаспадарчай каапэрацыі

Даклад аб рабоце Менсельгаскрэдытсаюзу зрабіў т. **Хадасевіч.**

— У часе вясеньняй пасеўнай кампаніі саюз правёў вялікую работу па забясьпячэньні сельскай гаспадаркі насеньнем, машынамі і інш. Па некаторых культурах плян забясьпячэньня нават значна перавышаны. Так, па аўсу плян выкананы на 169 проц., ячменю — 155 проц., гароднім насеньні — 114 проц.

Аднак, ёсьць і недавыкананьне пляну па некаторых культурах (сэрадэла, лубін, віка, канюшына).

Забясьпячэньне насельніцтва с.-г. машынамі праведзена наогул здавальняюча. Па дастаўцы плугоў плян забясьпячэньня выкананы на 87,8 проц., па дастаўцы барон — 67 проц., трыераў—136 проц. Слаба ідзе арганізацыя новых крэдытных таварыстваў. За тры кварталы арганізаваны толькі 2 таварыствы. З намечаных, паводле пляну, 13 вапнавых млыноў, 1 млын ужо пушчаны і 5 будуць пушчаны ў бліжэйшы час. Плян такім чынам **ня выкананы больш чым на палову.**

Нізавая сетка с.-г. крэдыткаапэрацыі ўступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва. 23 крэдытныя таварыствы заключылі паміж сабою сацыялістычную ўмову на лепшае абслугоўваньне калгасаў і беднаты, прыцягненьне сродкаў насельніцтва, большы ахоп насельніцтва каапэрацыяй і г. д.

Усяго па Менскай акрузе на 1 ліпеня бягучага году налічвалася 53 тысячы каапэраваных сялянскіх двароў (41% ўсіх сялянскіх гаспадарак па акрузе). Заданьне па каапэраваньні беднаты выканана Менсельгаскрэдытсаюзам на 97 процантаў (за 3 кварталы 3.340 бедняцкіх гаспадарак ахоплены сеткай с.-г. каапэрацыі).

З дакладам аб калгасным будаўніцтве па Менакрузе выступіў тав. **Каранеўскі.**

Зьезд закрыўся 18 ліпеня.

Г.

Водгукі на заметкі

КАЛЕШЧУКУ ВЫНЕСЕНА СУРОВАЯ ВЫМОВА

Гомельская АКК па сутнасьці допісу «Выбрыкі вылучэнца», дзе пісалася, што вылучэнец, член партыі Калешчук, абвінавачваецца ў растраце, выкарыстоўвае свае службовае становішча для асабістае мэты, паведамляе, што наогул факты пацьвердзіліся. Парткомітэт Гомельскай АКК Калешчуку абвешчана суровая вымова. Абвінавачаньне ў растраце судом не даведзена.

Справа перадана нарсьледчаму

Халопеніцкі РВК дае тлумачэньне па допісу «Растрата падатковых грошай», дзе піса лася аб незаконнай выдачы лесу і направільным падліку аб'ектаў абкладаньня Грыцкоўскім сельсаветам. У гаспадарцы Валховіча Янкі ўлічана аб'ектаў абкладаньня: 10,80 дзес. пахаці, 7,10 дзес. сенажаці, а разам у гаспадарцы Валаховіча налічваецца 17,90 дзес. зямлі. Адносна водпуску лесу гр. МЯСЬКО старшынёю Грыцкоўскага сельсавету—зроблена расьсьледваньне. Справа перадана нарсьледчаму.

Аддзяленьне Цэнтраземскладу ліквідавана

У свой час была даслана заметка рэд. «Зьвязды» пад загалоўкам «Як ліквідавалася аршанскае аддзяленьне Цэнтраземскладу». Аршанская АКК паведамляе, што факты злоўжываньня і п'янства некаторымі работнікамі аддзяленьня Цэнтраземскладу пацьвердзіліся. Аршанскае аддзяленьне ліквідавана. Справа аб злоўжываньнях некаторымі работнікамі перадана акрпракурору для прыцягненьня вінаватых да судовае адказнасьці. Цімафееву за п'янства абвешчана суровая вымова і ён зьняты з работы.

Мы абвергнем хлусьню антысэмітаў

Маскоўская рабочая дэлегацыя—аб яўрэйскіх калгасах БССР

Пазаўчора, а 6-й гадзіне раніцы ў Менск зьвярнулася дэлегацыя маскоўскіх рабочых, якая наведала яўрэйскія калгасы ў БССР. Старшыня дэлегацыі т. **Марозаў** (рабочы ф-кі «Хэмік») у гутарцы з нашым супрацоўнікам падзяліўся ўражаньнямі дэлегацыі.

За час з 18 па 21 ліпеня дэлегацыя наведала наступныя яўрэйскія калгасы: імя К. Маркса—(Меншчына), «1-га мая» (Бабр. акр.), «Хаўрус» (Гомельск. акр.), «Уперад», «Чырвоны Пахар», «Чырвоным шляхам» (Мазырск. акр.) і нядаўна арганізаваны калгас агароднікаў «Чырвоны партызан».

Асноўнае ўражаньне дэлегацыі—гэта вялізная дасягненьні ў гаспадарчым разьвіцьці калгасаў. У калгасах, якія мы наведалі, землеўпарадкаваньне праведзена поўнасьцю, усе калгасы перайшлі на шматпольле, разводзяцца розныя тэхнічныя культуры. Пры калгасах працавалі ў часе сяўбы пракатныя пункты, якія рабілі абмен і ачыстку насеньня для ваколічнага сялянства.

Пры некаторых калгасах, у майстэрнях праводзіцца дармовы рамонт с.-г. інвэнтару сялянскай беднаты. Уся моладзь уцягнута ў работу.

Культпраца ў калгасах пастаўлена вельмі слаба. Адсутнічае якое-небудзь кіраўніцтва з боку мясцовых арганізацый, усё што ёсьць, зроблена па ініцыятыве моладзі. Агранамічная дапамога калгасы забясьпечаны, але слаба пастаўлена праца па правядзеньні гутарак на с.-г. тэмы. Зусім слаба пастаўлена мэдыцынская і вэтэрынарная дапамога калгасам.

У большасьці калгасаў уся моладзь і жанчыны працуюць у суботу, дзень адпачынку перанесены на другі дзень. Амаль ва ўсіх калгасах пашыраецца гадоўля сьвіней.

— Усялякія размовы,—кажа т. Марозаў,—аб нядзольнасьці яўрэяў працаваць на зямлі, не адпавядаюць сапраўднасьці. Усюды мы наглядалі вялікі энтузіязм да работы, імкненьне ўзьняць прадукцыйнасьць працы.

Віцебска-сераднядзкая частка сялянства адносіцца да яўрэйскіх калгасаў вельмі спрыяюча. Дасягненьні яўрэйскіх калгасаў вялікія. Яўрэйскі калгас «Чырвоны араты», які арганізаваўся на месцы дэфіцытнага саўгасу, пачаў у кароткі тэрмін даваць прыбытак. Акруговае сялянства, бачачы посьпехі колгасу, прыступіла таксама да арганізацыі калгасу.

Дэлегацыя па прыезьдзе ў Маскву пазнаёміць маскоўскіх рабочых з вынікамі паездкі дэлегацыі, з шырокім рэстам яўрэйскіх калгасаў.

Учора пасьля работы дэлегаты выступалі на сходзе рабочых чыгуначнікаў. Сёньня дэлегаты выступаюць на сходах рабочых фабрыкі «Камунар» і «Бальшавік».

Сёньня ўвечары дэлегацыя выяжджае ў Маскву.

Скончыліся гастролі Дзяржаўнага цырку

Праўленьне Дзяржцыркаў узьняло перад СНК пытаньне аб пабудове пастаяннага цырку

Цыркавы сэзон у Менску ўчора скончыўся. Па даных дырэкцыі Дзяржцырку, за час знаходжаньня цырку ў Менску было дана 48 гастроляў, з якіх 7 раніцнікаў. За гэты час цырк наведала каля 80.000 чал., што прыблізна складае амаль 60 проц. насельніцтва г. Менску.

З прычыны таго, што цырк сябе апраўдаў, узьнікла пытаньне аб пабудове ў Менску цырку. Дырэктар дзяржцырку т. Фогэль паведаміў нашаму супрацоўніку, што заўтра ён выяжджае ў Маскву для дакладу цэнтральнаму праўленьню дзяржцыркаў СССР аб пабудове цырку. Ёсьць два варыянты пабудовы: або на месцы старога цырку, або радам з кіно «Культура». Цырк будзе пабудаваны на сродкі дзяржцырку СССР з прадстаўленьнем доўгатэрміновага крэдыту. Магчыма, што будынак цырку будзе гатовы ў гэтым годзе, бо пабудова цырку накшталт Казанскага і Варонескага, патрабуе, паводле новай тэхнікі, толькі 32 дні. Драўляны цырк будзе каштаваць 100 тыс. р., а каменны 500 тыс. р. Новы цырк разьлічаны на 3.000 месц.

Пытаньне аб пабудове новага цырку пастаўлена перад СНК БССР і ў бліжэйшы час будзе вырашана.

Г—ч.

— Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні ЦКК-РСІ Бел. (Савецкая, 55, 2-гі паверх), адбудзецца агульны сход ячэйкі КП(б)Б, сумесна з удзельнікамі брыгад па чыстцы савецкага апарату г. Менску, з наступным парадкам дня:

1. Пытаньне аб барацьбе з бюракратызмам і чыстцы сав. апарату на XVI-ай усесаюзнай партканфэрэнцыі і чарговыя задачы органаў КК-РСІ. Дакл. тав. Ранаў.
2. Бягучыя справы.

Яўка сяброў ячэйкі—абавязкова.

Запрашаюцца ўсе асьветнікі гор. Менску, а таксама курсанты настаўніцкіх курсаў.

Паведамленьні

ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня, 23-VII, роўна а 7-й гадз. увечары адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы з наступным парадкам дня:

1. Аб шляхох падняцьця сельскай гаспадаркі.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

Прэзыдыум Менскага дзяржаўнага палітэхнікуму, мясцком і Выканбюро студэнтаў з вялікім жалем паведамляюць аб не чаканай сьмерці дарагога выкладчыка Палітэхнікуму

Грабоўскага Пётры Засімавіча,

якая здарылася 17 ліпеня г-г. у гор. Кіславодзку.

Кіно-сад „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
ад аўторка, 23 ліпеня
вялікі мастацкі гістарычны фільм. Дзеяньне адбываецца ў эпоху панаваньня Аляксандра II і Аляксандра III

ПАЛАЦ І ЦЫТАДЭЛЯ

гістарычная кіно-драма ў 10 частках.
У галоўных ролях вядомыя артысты КОНРАД, ЯКАЎЛЕЎ, БАРАНІХІН, ШЫШКО.
У карціне зьнята Петрапаўлаўская цытадэля,—вядомы Аляксееўскі равэлін, а таксама эпізод замаху на забойства Аляксандра II—Д. Караказавым.
2 СЭАНСЫ:— Пачатак 1-га а 9 гадзіны 15 м., 2-га—10 гадзін 45 м.
У садзе грае духавы аркестр пад кіраўніцтвам БЫКАВА.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА
Аўторак, 23 ліпеня — Для першага выхаду артыстых К. Ю. Красавінай, А. І. Асмоловай, Вайнароўскага „МАРИЦА" музкамэдыя ў 3-х дз., Кальмана
Серада, 24 ліпеня — „СИЛЬВА" музкамэдыя ў 3-х дзеях, Кальмана.
Чацьвер, 24 ліпеня — „НОЧЬ ЛЮБВИ" муз. мазаіка ў 3-х дзеях, Валенціна
Білеты на абвешчаныя спэктаклі прадаюцца ў касе Дзяржтэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. касе з 12—2 і ад 4—6 гадз. увеч. Дырэкцыя.

TRYBUNA RADZIECKA
GAZETA ROBOTNICZA
WYCHODZI 3 RAZY NA TYDZIEŃ
„ТРИБУНА РАДЗЕЦКА"
ЦЕНТРАЛЬНАЯ ПОЛЬСКАЯ ГАЗЕТА В СССР
Отв. редактор т. ДОМБАЛЬ.
Ею издаются журналы: 1. „Мысль Большевицкая" (редколлегия: Феликс Кон., Н. Нейман, Т. Домбаль и др); 2. „Культура масс" (отв. редактор известный писатель т. Бруно Ясенский). Газета „Трибуна Радецка" подробно информирует о жизни поляков в СССР, Польше и заграницей.
ПОДПИСНАЯ ПЛАТА: в месяц—30 коп., 3 мес.—85 к., в год—3 р.
Подписка принимается во всех почтовых отделениях и главной конторой: Москва, Центр. ул. Дзержинского, 15.

ЮЖХИМТРЕСТ
ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ
ХИМСИНДИКАТ

САЧЭЦЕ
Да заўтра !!!

ТАРГІ
Саўгас Дарашэвічы, Мазырск. акр., Пятрыкоўскага р., здае ў арэнду з таргоў сад (16,5 гек.)
Таргі адбудуцца 1-га жніўня 1929 года у саўгасе

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
АД АЎТОРКА 23 ЛІПЕНЯ
НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
НЕСПАДЗЯВАНЫ ГЭРОЙ
Пачатак сэансаў а 7 с пал. г. Каса—ад 6 г.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА" Ад аўторка, 23 ліпеня
Мастацкі фільм
ШУКАНЬНЕ ДОЛІ
Рэжысэр—М. Царэвічанка
Мастак—І. Суораў
Галоўныя ролі выконваюць: Астап Мандрыка, І. Капралаў, Таўт—Корсо, Д. Капка, Б. Загорскі, Н. Надземскі і інш.
зьвыш праграмы гастролі ўсходняга ансамбля, сусьветнага атракцыёну
П=А=І
і яго партнераў: Ірмы Варэска, І. Кларці.
Хто такі П А І?
Удасконаленая тэхніка сучаснасьці. Бліскучая абстаноўка і апаратура і нацыянальная вопратка.
Пачатак роўна а 7 з пал. гадз. | Каса адчынена ад 6 гадз.

Издательство „ПРАВДА"
Продолжается прием подписки
НА ЕЖЕНЕДЕЛЬНЫЙ ЖУРНАЛ
„КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ"
ОРГАН ИККИ
11-й год издания
„КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ"—еженедельный боевой орган Исполкома Коммунистического Интернационала, отражающий идеологическую и тактическую линию Исполкома и весь опыт международного коммунизма.
„КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ" ведет в первую очередь непримиримую борьбу с оппортунизмом и соглашательством в рядах рабочего класса.
„КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ" является мощным оружием большевизац. Коминтерна, оружием борьбы против всякого рода шатаний, скептицизма и пессимизма в большевистских рядах.
„КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ" уделяет особое внимание национально-освободительной борьбе угнетенных народов.
„КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ" беспощадно разоблачает империалистов и его социал-демократических агентов.
„КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ" собирает весь опыт мирового пролетарского движения и пятидесяти секций Коминтерна, привлекая к активному участию в журнале все лучшие силы международного коммунизма.
ПОДПИСНАЯ ЦЕНА:
На 1 мес.—1 р., 3 мес.—3 р., 6 мес.—6 р., 12 мес.—12 р.
ЦЕНА ОТДЕЛЬНОГО НОМЕРА 25 к.
ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: в Белоруссии—Об'единенным Отделением Издательств „Известия" ЦИК СССР и ВЦИК'а „Правды", (г. Минск, Советская, 61) его экспедициями и уполномоченными.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У —
кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

ПРАДАЮЦЦА
БОЧКІ з жалезнымі абручамі ад друкарскай фарбы.
БАЛЁНЫ у плеценых кашох з-пад саляной кіслаты.
Зварочвацца да заг. гаспад. друк. «Зьвязды» (Савецкая, 63) ад 3—5 гадз. дня.

МУЖ-ЖЕНЕ!
должен приобрести, если хочет сэкономить ДЕНЬГИ и иметь вкусно приготовленную пищу, кст. поварен. книгу Анипа. Раст., молочн. стол. Меню 500 разн. питат. вегетар. и диетич. блюд (завтраки, обеды, ужины, дессерты, печенье и пр.). Цена 1 р. 50 к., в перепл. 1 р. 75 к. Высыл. налож. плат. Москва, Политехнический музей, 110|26 „КУЛЬТУРА и ЗНАНИЕ".

21 ліпеня, а 6 гадз. увечары па дарозе з Менску ў Ратомку ПАКІНУТА ў пягніку жаночае ПАЛЬТО з сінага бастону на цёмнажоўтай пакладзы. Просьба зьвярнуць за ўзнагароду па адрасе: ст. Ратомка, будынак школы, Слабодкінай Р.

Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Ад аўторка, 23 ліпеня
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
з цыклю вядомае карціны „Чатыры чорта" паводле раману ГААДА
ТРАГЭДЫЯ АКРАБАТА
драма з жыцьця цырку ў —) 8-мі частках (—
У ГАЛОЎНАЙ РОЛІ
Карэль дэ-Фогт
Пачат. сэансу а 7 г. 30 м.
Каса адчынена ад 5 г. 30 м.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ
на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы
НА ГАЗЭТУ
ЗЬВЯЗДА
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60 к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоча-Крэсьтянскі КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, не упоўнаважанымі, аддз. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", аддз. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.
З мэтай эканоміі газэтнай паперы, камплекты газэты „Зьвязда" будуць друкавацца ва першыя чысла кожнага месяцу ў самай абмежаванай колькасьці.
Таму гал. кантора газ. „Зьвязда" просіць усіх падпісчыкаў здаваць падпіску да 28-га чысла. Па заказах, якія паступяць у гал. кантору несвоечасова, к-ра не гарантуе высылкі газэты камплектам за першыя чысла, а толькі са дня паступленьня заказу.
Каб забясьпечыць атрыманьне першых нумароў «Зьвязды» за жнівень, просьба падпісацца загадзя, не пазьней 27—29 ліпеня.

КІНО СПАРТАК
Ад аўторка, 23-га ліпеня
Зьвыш праграмы гастролі артыста Ленінградз. тэатраў Б. А. Валенціна
У праграме сатыра, юмар, частушкі Разанскай губ., куплеты «Месяц з усіх бакоў» на злобу дня,
На экране сусьв. фільм „МАТЬ" М. ГОРКАГА др. у 7 част.
Пачатак а 7 г. 30 м. Каса адчынена ад 6 г.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Ленінская, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраным, хірургічным, жаночым, зубным, вока, нэрвах, вуха, горла, носа і скуры
Фізіятрычны габінэт: шкварц, электра і сьвета-лячэньне.
Рэнтгенаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых
Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.
— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты ад бываецца да 2-ое гадзіны дня

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакумэнту

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Каапэрац. кніжка Бурскай М. М., выд. Менск. прыгаразн спажыв. т-вам «Земляроб» 2095
Дазвол на выраб пячаткі і штампу для заводу «Камінтэрн», выд. Барысаўскім гарсаветам 2096
Асабовае пасьведч. Заремба В. В., выд. Менакрэа 2097
Членская кніжка № 6492 Рымашэўскага С. М., выд. саюзам Рабземлес 2098
Чл. кніжка саюзу чыгуначнікаў, асабовае пасьведч., выд. к-рай аддзелу цягі ст. Жлобін Зах. ч. 2099-2100
Метрычная выпіс Фішкіна А. Г., выд. Менскім ЗАГС'ам 2101
Камсамольскі білет № 7083 Гольдзінай Э. А., выд. Варысаўск. РК ЛКСМБ 2102
Партбілет Зільбэрштэйна І. М., выд. гаррайкомам КП(б)Б 2103
Асабов. пасьведч. Якуціка А. С., выд. МШУ МБВ чыг. 2104
Час. пасьведч. аб сканчэньні Белгідратэхнікуму Лігуноўскага А. А. за № 668 2105
Час. пасьведч. аб сканчэньні Белгідратэхнікуму Вішнеўскага А. И. за № 660 2106
Пасьведчаньне аб сканчэньні 15-й Бел. сямігодкі Давідовіч З. Ф. 2107

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск Галоўлітбел № 528.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2